ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 18 (2071)
1 сакавіка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАПЯРЭДАДНІ ЮБІЛЕЮ

Рэспубліка рыхтуецца шырока адзначыць 70-годдзе з дня нараджэння свайго старэйшага драматурга і сатырыка, віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР, народнага пісьменніка Кандрата Крапівы. Бібліятэкі наладжваюць выстаўкі яго твораў і навуковых прац, школы рыхтуюць вечары, прысвечаныя жыццю і творчасці.

Днямі ў Мінску ў бібліятэцы імя Ул. І. Леніна адбылася сустрэча юбіляра з чытачамі. Сярод выступаючых былі кандыдат філалагічных навук В. Івашын, галоўны бібліограф Н. Ватацы, аспірант БДУ імя Ул. І. Леніна В. Рагойша. Народны артыст СССР Г. Глебаў і народны артыст БССР Л. Рахленка паказалі ўрывак з п'есы К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Пісьменнік прачытаў некалькі сваіх новых баек.

На здымку: Кандрат Кандратавіч сярод удзельнікаў сустрэчы.

Фота Ул. КРУКА.

Рана завітала сёлета на беларускую зямлю вясна. Выйдзеш на вуліцу — дыхаецца на поўныя грудзі. І настрой, настрой вясновы, радасны. І яшчэ, ён радасны ад таго, што мы ў чаканні вялікай падзеі— XXIII з'езда КПСС.

Для рабочых перадавога ў Оршы прадпрыемства—сілікатнага завода № 1 кожны дзень, што застаўся да адкрыцця з'езда,—гэта дзень вытворчых перамог. На гэтым здымку вы бачыце лепшага фармоўшчыка блокаў пенасілікатнага цэха Г. Гальмакова. Стаўшы на працоўную перадз'ездаўскую вахту, ён штодзённа перавыконвае нормы выпрацоўкі.

Фота Г. УСЛАМАВА.

(БЕЛТА).

НАШ СУЧАСНІК

ДЗЕНЬ, ЯКІХ МНОГА

М. ЗАМСКІ

Я думаў, што будзе так: прыходжу да Мікалая Аляксандравіча Булаўскага, паказваю яму карэспандэнцкае пасведчанне і расказваю аб тым, што маю намер напісаць нарыс пра дзень сакратара райкома.

Мікалай Аляксандравіч адразу ж выклікае машыну, і мы пачынаем калясіць па гаспадарках. Сакратар сустракаецца з мясцовымі кіраўнікамі, з хлебаробамі, гаворыць ім пра розныя важныя рэчы, я запісваю, і справа зроблена.

— Але ж за дзень я не бываю больш, чым у адной, ад сілы ў дзвюх гаспадарках, — сказаў Мікалай Аляксандравіч, — трэба ж у брыгадах, на фермах пабыць, грунтоўна разабрацца ва ўсім. Мяркую, што не варта ламаць такі парадак і дзеля карэспандэнта. А то скажуць, што гэта за сакратар, які скача галопам па Еўропе. Калі ёсць жаданне, дык паедзем зараз са мной у калгас імя Войкава. Там справаздачна-выбарчы сход будзе,—ён паглядзеў на гадзіннік,—час ранні, паспеем да сходу па гаспадарцы паездзіць. Згодны?

Я гляджу на Булаўскага і чамусьці толькі цяпер заўважаю, што ён здорава пастарэў за гэтыя чатыры гады, што ведаю яго. Вузкі твар з вялікімі залысінамі ўвесь у зморшчынах. А яму ж яшчэ і сарака няма... Відаць, нялёгка даецца сакратарства.

Памятаю, у шэсцьдзесят другім, калі Мікалай Аляксандравіч прыйшоў у раён на пасаду сакратара парткома вытворчага калгаса-саўгаснага ўпраўлення, многіх здзівіў яго стыль работы. Прыедзе ў гаспадарку, гутарыць з мясцовымі кіраўнікамі як роўны. Ні вокрыку, ні «каштоўных указанняў».

Заігрывае — рашыў сёй-той у раёне. А потым і другі клопат выказваць пачалі — распусціць гэты Булаўскі кадры на сваю ж галаву. Потым схамянецца, ды позна будзе. У нас народ да цвёрдай рукі прывычны.

Прызнацца, і мне пазіцыя сакратара таксама здавалася дзіўнай. Да гэтага я амаль дзесяць гадоў працаваў у іншых раёнах і прывык, што першага сакратара райкома за вочы называюць «гаспадаром». «Гаспадар сказаў», «гаспадар патрабаваў»... А тут... Памятаю такі выпадак. Прыехаў я па сваіх газетных справах у саўгас «Рогаўскі».

— Дзе начальства?—пытаюся.

— Азімае поле пайшлі Булаўскаму паказваць, — адказваюць канторскія работнікі.

Падаўся і я туды. Здалёк заўважыў высокую хударлявую фігуру сакратара і каля яго некалькі чалавек. Падышоў да іх. Чую такую размову.

— Бачыце, Мікалай Аляксандравіч, якія ўсходы жыта рэдкія. Можа, заараць і зноў пасеяць?— пытаўся аграном, пажылы сівы мужчына.

— Дык вы ж аграном, самі і вырашайце. А я не спецыяліст...— пацісну плячыма Булаўскі.

— Але ж вы сакратар, як скажаце, так і зробім,—аддана гледзячы ў твар Мікалая Аляксандравіча, гаварыў аграном.

— Вы за ўраджай перажываеце, ці толькі за тое, каб перад начальствам добра выглядаць?— з прыкрасцю спытаў Булаўскі і, рэзка павярнуўшыся, пайшоў да машыны.

Прысутныя пераглянуліся і пайшлі следам за ім. А я ў сваіх думках у гэты момант перанёсся на некалькі год назад.

Прыехаў неяк пры мне ў калгас сакратар райкома — невысокі чарнявы чалавек з заўсёды кіслым выразам твару. Старажылы раёна казалі, што за ўвесь час не бачылі ў яго ўсмешкі. Было гэта ў канцы мая, якраз садзілі бульбу. Дзейнічаў тады суровы цыркуляр—садзіць бульбу толькі квадратна-гнездавым спосабам. Сакратар доўга лазіў па полі са складной лінейкай і меру ў адлегласць паміж гнёздамі, каб было роўна семдзесят на семдзесят сантыметраў. Следам за начальствам крочылі старшыня і аграном. Кожны раз, калі сакратар выймаў з кішэні меру, твары іх станавіліся разгублянымі. Пакуль што ўсё ішло добра, але вось сакратар наблізіўся да саду, што межаваў з полем. У садзе дзве паркі коней разворвалі барозны. Некалькі жанчын ішлі следам і кідалі ў барозны бульбу.

— Што гэта такое?..—ціха спытаў сакратар у старшыні.

Той, стараючыся не глядзець у вочы начальству, растлумачыў, што тут таксама садзяць бульбу.

— С-стужкавым с-спосабам?

— Але ж у садзе інакш нельга...

— Н-не, я пытаюся, чаму стужкавым спосабам? Вы пастанову чыталі, што ніводнага гектара бульбы не павінна быць пасаджана стужкавым спосабам? Чыталі, ці не?

— Чытаў.

— Каб заўтра былі на бюро райкома.

...З саўгаса я ехаў дадому разам з Булаўскім.

— Ну, як вам гэты аграном спадабаўся? — спытаў ён.

Я пацісну плячыма:

— Адказнасці баіцца, таму ў вас і пытаўся, што з жытам рабіць.

— Во, во, іменна адказнасці. У нас правільна гавораць, што камандванне і пастаянныя падказкі зверху адмоўна ўплываюць на гаспадарчыя справы. Сапраўды, на месцы лепш відаць, як і што рабіць. Але нам трэба адстайваць права гаспадарак выносіць самастойныя рашэнні не толькі па гэтай прычыне. Справа ў тым, што многія гаспадарнікі за гэтыя гады прывыклі жыць толькі на падказках, развучыліся самастойна думаць. Яны толькі скардзяцца, што вось, маўляў, зверху скоўваюць іх ініцыятыву і гэтак далей. А ў душы баяцца гэтай свабоды, баяцца адказнасці. Сённяшні выпадак—яркі прыклад гэтага, такіх людзей трэба нанава выхоўваць...

...Па дарозе ў калгас імя Войкава Мікалай Аляксандравіч інфармуе мяне наконт паказчыкаў, якіх дабіўся раён у мінулым годзе. Па вытворчасці малака ён займае першае месца ў рэспубліцы, мяса—чацвёртае. Збожжавых атрымалі на круг па 15 цэнтнераў з гектара.

— У нас, фактычна, няма цяпер адстаючых гаспадарак, — заўважае сакратар.

— А калгас імя Войкава, у які мы едзем?

— Быў адстаючы, а цяпер «кітоў»-нашых падпірае. Летась па 17 цэнтнераў збожжа з гектара сабралі войкаўцы. І іншыя гаспадаркі, што раней ад ветру хісталіся, цяпер трывала стаяць на нагах.

— Матэрыяльна дапамаглі ім?

— І гэта ёсць, але галоўнае не ў тым. Бывае, што ўкладваюць у гаспадарку сродкі, але, як у дзіравую торбу, — толькі далі, а вось ужо і следу ад іх няма. У людзях уся справа, у кадрах. Вось гэта наш галоўны клопат. Цяпер у кожнай гаспадарцы ў нас кадры і спецыялістаў, і брыгадзіраў, што трэба. У асноўным — камуністы. Любую справу вырашаюць прынцыпова, умела. Вось нядаўна зусім, — Мікалай Аляксандравіч усміхнуўся,— прыбягае ў райком дырэктар саўгаса «Вішнёўка» Баштанік. Хлопец ён адукаваны, аграном па спецыяльнасці, але ўзяў за моду на людзей крычаць. Дык вось, значыць, заходзіць да мяне і скардзіцца, што сёй-той з яго падначаленых перашкаджае яму наладжваць дысцыпліну ў гаспадарцы, выдумвае, што грубы ён і яшчэ рознае. «Я хачу, каб вы прыехалі, Мікалай Аляксандравіч,—кажа, — і пакаралі гэтых людзей—яны ж камуністы».

«І не падумаю,—гавару,—у вас моцная партарганізацыя. Збярэцца сход і вырашыць, чыя праўда, ці ваша, ці тых, хто вас крытыкуе. Што камуністы скажуць, тое і будзе».

Пакруціў дырэктар носам і пайшоў. Назаўтра там сход сабралі. Наш інструктар на ім быў. Расказвае, наладзілі Баштаніку такую лазню, што ён не ведаў, куды вочы схаваць. Тут жа камуністам паабяцаў, што грубага слова ад яго больш ніхто не пачуе. А пасля сходу прызнаўся Баштанік, што колькі жыве, у такім пераплёце не быў. Вось так...

...Першая навіна для мяне ў

[Заканчэнне на 4-й стар.].

БЕЛАРУСКІЯ ВЕРШЫ—ГОСЦІ КІЕВА

Нядаўна на заканчэнне ўкраінскай рэспубліканскай нарады перакладчыкаў, у Кіеўскім Доме літаратараў адбыўся вечар, прысвечаны маладой беларускай паэзіі. Адкрыў яго вядомы ўкраінскі перакладчык Рыгор Кочур, які падкрэсліў вялікую папулярнасць паэзіі братняй Беларусі сярод украінскіх чытачоў.

А потым у зале гучалі вершы беларускіх паэтаў на ўкраінскай мове. На пачатку пераклад «Пагоні» М. Багдановіча чытае Р. Лубкоўскі. Потым гучаць творы Р. Барадуліна, Д. Бічэль-Загнетавай, Ул. Караткевіча, Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, А. Пысіна, А. Наўроцкага, В. Вярбы, А. Вярцінскага, П. Макаля, Р. Семашкевіча, М. Рудкоўскага, Ю. Свіркі, Я Сіпакова, І. Летко, В. Макарэвіча. Лепшыя з перакладаў, якія прагучалі на вечары, будуць змешчаны ў пятым нумары часопіса «Дніпро».

Вечар прайшоў з вялікім поспехам.

Рыгор ПАЎТАРАК.

г. Кіеў.

КАНЦЭРТ АСПІРАНТА

Днямі ў вялікай канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбыўся справаздачны канцэрт аспіранта Яўгена Грамыкі, які закончыў свае заняткі ў аспірантуры пры кансерваторыі. Кіраўніком аспіранта быў загадчык дырыжорска-харавога факультэта, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Віктар Роўда. Я. Грамыка падрыхтаваў з Беларускім дзяржаўным хорам праграму, у якую ўвайшлі беларускія і рускія народныя песні і творы сучасных савецкіх кампазітараў. Аспірант паказаў, што добра адчувае асаблівасці народнай песні. Пасля заканчэння аспірантуры ён будзе працаваць выкладчыкам у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і хормайстрам у Беларускім дзяржаўным народным хоры.

У аспірантуры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі вучыцца зараз разам з завочнікамі 12 аспірантаў па спецыяльнасцях харавога дырыжыравання, фартэпіяна, скрыпкі, народных інструментаў, кампазіцыі. Наступны выпуск аспірантаў адбудзецца ў канцы гэтага года па спецыяльнасцях харавога дырыжыравання (М. Хвясюк) і цымбал (А. Лянчык).

СЕННЯ У ГАЗЕЦЕ:

АРХІТЭКТУРНАЯ СТАРОНКА

І вось з'явіўся яшчэ адзін сцяжок на карце будоўляў рэспублікі: Магілёў—Лаўсанбуд... Два словы—а за імі змены ў лёсе цэлага горада! Буйнейшы ў Еўропе лаўсанавы камбінат, які будуецца тут, дасць каштоўную хімічную сыравіну і якасныя тканіны. Увядзенне ў строй новай вытворчай магутнасці — гэта новыя жылыя масівы, школы, яслі, установы бытавога абслугоўвання. Гэта, нарэшце, перагляд транспартных сувязей горада, перапланіроўка вуліц, пашырэнне інжынерных камунікацый... Дзесяткі складаных горадабудаўнічых праблем, абумоўленых новай будоўляй, прывялі да кардынальнага перагляду ўсяго генеральнага плана развіцця Магілёва.

У чым сутнасць гэтых праблем? Як звязаны яны з задачамі сённяшняга будаўніцтва? Які адбітак пакінуць на архітэктурным абліччы горада ў цэлым?

Пра гэта расказваецца ў нашай чарговай «Архітэктурнай старонцы».

У МАГІЛЁЎСКІХ АРХІТЭКТАРАЎ

Нядаўна ў Магілёўскім абласным упраўленні будаўніцтва і архітэктуры разам з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі Магілёва была разгледжана схема новага генеральнага плана горада, якая карэнным чынам абнавілася ў сувязі з будаўніцтвам камбіната сінтэтычнага валакна. На пасяджэнні быў разгледжаны праект дэталёвай планіроўкі Заднепроўскага раёна ў паўднёвай частцы горада, дзе сёння вядзецца вялікае жыллёвае будаўніцтва. У наступным годзе ў гэтым раёне плануецца пабудаваць Палац культуры на 1200 месц. Праект Палаца распрацоўвае аўтарскі калектыў «Белдзяржпраекта».

□

«Будучыня Магілёва» — лекцыі на такую тэму часта чытаюць архітэктары Магілёўскага аблпраекта. Каля пяцісот студэнтаў Магілёўскага педінстытута слухала нядаўна лекцыю, якую прачытаў архітэктар А. Хальпукоў. Архітэктар А. Кучарэнка расказваў пра будучыню горада ў клубе чыгуначнікаў, у кінатэатрах перад дэманстрацыяй фільмаў, на заводзе штучнага валакна. Кіраўнік архітэктурнай майстэрні Д. Воранаў часты госць у сярэдніх школах горада.

□

У аблпраекце пачата праектаванне новага раённага стадыёна на 20 тысяч чалавек. Часова, да таго, як будзе пабудаваны вялікі гарадскі стадыён, на раённым стадыёне будуць праводзіцца ўсе абласныя і гарадскія спартыўныя спаборніцтвы.

НАТХНЁНАЕ СЛОВА ПРА МІР

КАЛЕКТЫЎНЫМІ НАМАГАННЯМІ ПІСЬМЕННІКАЎ, ВУЧОНЫХ І МАСТАКОЎ 25 КРАІН У МАСКВЕ СТВАРАЕЦЦА «БЛАКІТНАЯ КНІГА МІРУ»

Гэта кніга яшчэ не выйшла ў свет, але ў яе ўжо ёсць свая гісторыя.

Мінулай вясной Галіна Уланава, Сяргей Канёнкаў, Юрый Гагарын, Сяргей Герасімаў, Дзмітрый Шастановіч і нобелеўскі лаўрэат Міхалай Сямёнаў звярнуліся да сваіх савецкіх і зарубежных калег з заклікам стварыць агульнымі намаганнямі вялікі публіцыстычны зборнік, прысвечаны самай надзённай праблеме сучаснасці — барацьбе народаў за прадухіленне ядзернай вайны.

«У гэтай кнізе, — гаварылася ў Звароце,—мы хочам апублікаваць выказванні ці фатаграфіі сусветка вядомых пісьменнікаў і вучоных, музыкантаў і дзеячоў кіно, мастакоў і артыстаў, якія непакояцца пра заўтрашні дзень чалавецтва. Няхай гэта будуць пісьмы або артыкулы, малюнкі, навелы або вершы; асноўнае — перадаць людзям вашу ясную думку і ваша слова ў абарону міру на зямлі».

Зварот быў перакладзены на замежныя мовы і разасланы ў большасць краін свету.

Шматлікія водгукі не прымусілі сябе чакаць. Першая ластаўка прыляцела з Парыжа ад славутага карыкатурыста Жана Эфеля. Больш дакладна, гэта была не ластаўка, а два галубы, якія цалаваліся. А неўзабаве быў прысланы малюнак і Рокуэлам Кентам. У сваёй улюбёнай манеры Кент намаляваў адзіноную фігурку малога, які стаіць пад чорным небам сярод руін вялікага горада. Подпіс пад малюнкам абвяшчаў: «Ці такі свет павінен дастацца нашым дзецям?»

Выдатны мастак сучаснай Амерыкі прыняў самы рупны ўдзел у папулярызацыі ідэі зборніка. «Як толькі я атрымаў Зварот, падпісаны пані Уланавай, Гагарыным і іншымі, — паведаміў ён у Маскву,— я вырашыў, не кансультуючыся з вамі, размножыць яго і разаслаць як мага большай колькасці амерыканцаў — прадстаўнікоў мастацтва і літаратуры». Рокуэл Кент па ўласнай ініцыятыве накіраваў Зварот 250 членам Акадэміі мастацтваў і літаратуры ЗША і Нацыянальнага інстытута мастацтваў і літаратуры, а таксама некаторым вучоным.

Намаганні Кента былі багата ўзнагароджаны. Многія з тых, каго ён пазнаёміў з задумаю «Блакітнай кнігі міру», прыслалі ўжо ў Маскву свае матэрыялы. Пісьменнік Бенджамін Апель, напрыклад, напісаў усхваляваны нарыс, у якім падзяліўся ўражаннямі ад паездкі па краінах Еўропы, дзе чвэртну стагоддзя назад праляцеў вогнены смерч другой сусветнай вайны. Апеля асабліва ўзрушыў расказ адной ленінградскай жанчыны, што сваімі вачыма бачыла, як у час фашысцкай блакады гэтага горада дзяцей, якія памерлі ад голаду, адвозілі ў морг у іх жа калясачках.

Рад іншых водгукаў сведчыць пра сур'ёзную трывогу сусветнай грамадскасці перад пагрозай адраджэння нацысцкага варварства. Патрабаванне міралюбівых сіл' — уціхамірыць недабіткаў-гітлераўцаў — безумоўна, стане адной з галоўных тэм кнігі. Яе можна сфармуляваць наступнымі словамі з пісьма югаслаўскага мастака Мілуна Мітравіча: «Германія на працягу паўстагоддзя двойчы растаптала, спаліла і спустошыла Еўропу. Нацысцкія забойцы паселялі смерць ад Атлантыкі да Сталінграда, ад Нарвіка да Тобрука. Усе народы павінны ўсведамляць небяспеку заходнегерманскага рэваншызму. Іх узброеванне павінна быць спынена і, у першую чаргу, іх трэба пазбавіць магчымасці валодаць атамнай зброяй.

У той жа час многія аўтары кнігі разумеюць тое, што сёння ў адной частцы Германіі існуе магутная сацыялістычная дзяржава, якая стала апорай міру на нямецкай зямлі. Пра гэтую гістарычную змену ў лёсе нямецкай нацыі вельмі ўдала выказаўся Людвіг Рэн — адзін з вядомейшых пісьменнікаў ГДР. Прывядзём цалкам яго пісьмо, прысланае для публікацыі ў «Блакітнай кнізе міру»:

«Я быў добраахвотнікам у дзвюх войнах. У першую сусветную вайну я палез, таму што нас так выхавалі. На вайну на баку Іспанскай рэспублікі я пайшоў свядома, каб змагацца супраць фашызму і прадухіліць другую сусветную вайну. Нам гэта не ўдалося, бо нас было вельмі мала. Аднак трэцюю сусветную вайну мы прадухілім, калі зможам ізаляваць падпальшчыкаў вайны. Сёння галоўная задача кожнага работніка мастацтва складаецца з таго, каб разам з народам працаваць у імя міру».

Нарвежскі пастар Рагнар Форбек і французскі празаік Марыс Друон, чылійскі сенатар Балтазар Кастра і савецкі жывапісец Марцілрос Сар'ян, нябожчыца сёння, каралева Бельгіі Елізавета і прэзідэнт Акадэміі навук Манголіі Шырэндыб... Такое далёка няпоўнае кола аўтараў «Блакітнай кнігі міру» ўсё пашыраецца. Аддаўшы шырокую трыбуну розным пунктам гледжання на праблемы міжнароднай бяспекі, гэта кніга прадоўжыць высакародныя традыцыі шматлікіх кангрэсаў і сустрэч прыхільнікаў міру ўсіх кантынентаў.

Многія аўтары з гневам пішуць пра бясчынствы амерыканскіх імперыялістаў ва В'етнаме, Дамініканскай Рэспубліцы і іншых раёнах зямнога шара. Характэрна, што іменна ў агрэсіўнай палітыцы правячых колаў ЗША прадстаўнікі розных прафесій, пераканаанняў і палітычных партый бачаць цяпер найбольшую пагрозу міру. Пра гэта, у прыватнасці, гаворыцца ў пісьмах аргенцінскай пісьменніцы Марыі Росы Алівер, індыйскай грамадскай дзеячкі Аруны Асаф Алі. Былы прэзідэнт Гватэмалы Хакаба Арбенс Гусман, напрыклад, заяўляе: «Для імперыялізму вайна побач з гонкай узбраенняў з'яўляецца бізнесам. Амерыканскія манаполіі сканцэнтравалі ў сваіх руках такую фінансавую і палітычную ўладу, якая дазволіла ім у многіх выпадках праводзіць сваю агрэсіўную палітыку захопу і нястрымнага рабаўніцтва ва ўсіх краінах, якія трапілі ў сферу іх уплыву».

А вось другая заява. Яна належыць аўстралійскай пісьменніцы Дзімфне К'юсак — аўтару вядомага антыфашысцкага рамана «Гарачае лета ў Берліне». Дзімфна К'юсак расказвае на старонках «Блакітнай кнігі міру» пра разбэшчваючы ўплыў «халоднай вайны», якая старанна раздуваецца імперыялістычнай прапагандай. «За мінулыя 20 гадоў пасля заканчэння вайны ні адно дзіця ў заходнім свеце не бачыла нармальнага жыцця, — сведчыць аўстралійская пісьменніца. — Штодня, штогадзіны радыё, друк і кіно выпускаюць прапаганду «халоднай вайны», і жыццё як маладых, так і старых у роўнай ступені азмрочана прывідам трэцяй сусветнай вайны — больш жахлівай, чым любая, якую чалавецтва ўжо зазнала. У адрозненне ад дзяцей у сацыялістычных краінах нашы дзеці прасякнуты ідэалогіяй гвалту і расавай нянавісці».

«Блакітная кніга міру» знаходзіцца ў працэсе стварэння. Але і цяпер ясна, што яна стане хвалюючым чалавечым дакументам. Ужо паступіла 57 разнастайных матэрыялаў з 25 краін, і паток іх усё расце. Многія дзеячы мастацтва знайшлі для свайго водгуку арыгінальную форму. Венгерскі скульптар Кішфалудзі-Штробль прыслаў фотаздымак галоўнай фігуры свайго манумента, прысвечанага савецкім воінам, якія загінулі за вызваленне Венгрыі, паэт з ФРГ Карл Рогаль — вершы і малюнкі, а амерыканскі кампазітар Вінсент Персішэці — ноты песні аб міры.

Зразумела, ад сваіх зарубежных калег не адстаюць і дзеячы савецкага мастацтва і літаратуры, вучоныя. Актыўны ўдзел у стварэнні кнігі прымаюць паэт Пятрусь Броўка, экс-чэмпіён свету па шахматах Васіль Смыслоў, мастак Барыс Правокаў, акадэмік Андрэй Калмагораў і многія іншыя. Хочацца прывесці вытрымку з артыкула рэжысёра Сяргея Бандарчука — пастаноўшчыка кінаэпапеі «Вайна і мір». Жывучы апошнія гады ў свеце талстоўскіх вобразаў, ён працытаваў наступнае выказванне вялікага пісьменніка: «Усе думкі, якія маюць велізарныя вынікі, заўсёды простыя. Уся думка ў тым, што, калі людзі разбэшчаныя звязаны памiж сабою і складаюць сілу, дык людзям сумленным трэба зрабіць толькі тое ж самае».

Гэтыя словы выдатнага гуманіста маглі б стаць цудоўным эпіграфам да «Блакітнай кнігі міру».

Фелікс ПАНЯВЕЖСКІ.

(АДН).

ЛЯ СЭРЦА РЭАКТАРА

РЭПАРТАЖ

Ледзь пераступіўшы парог рэактара, я ўжо млеў у чаканні экзотыкі. Так і здавалася, што вось зараз з-за вугла выскачыць які-небудзь Гусеў з запаленым індыкатарам-аўтаручкай у нагруднай кішэні белага халата, як у памятным кадры «Дзевяці дзён аднаго года». І завые сірэна, і замільгаюць папераджальныя таблічкі: «Небяспечна! Небяспечна! Небяспечна!».

Але тут стаяла звычайная цішыня, не загараліся ніякія таблічкі, а замест Гусева з-за вугла нетаропка выйшаў высокі хлопец спартыўнага выгляду, і тут мне шапнулі, што гэта той самы Гонаў, пра якога мы толькі што гаварылі.

Яму было на выгляд крыху болей за дваццаць пяць, але, на мой погляд, гэта ўсё роўна не так ужо многа для той адказнай пасады, якую ён займае. Што гэта за пасада,—няважна, дастаткова толькі сказаць, што пяцёра ў белых халатах на чале з Гонавым праз кожныя суткі на дваццаць чатыры гадзіны становяцца паўнаўладнымі гаспадарамі рэактара і трымаюць у сваіх руках яго уранавае сэрца.

Трымаюць у руках—гэта, вядома, у пераносным сэнсе. Да сэрца рэактара дацягнуцца не вельмі проста—яно схавана за шасціметровай таўшчынёй дыстыляванай вады і толькі адсвечвае з-пад яе цьмяным зеленаватым зззянем. Але каманда Гонава выводзіць рэактар на магутнасць, і гэтага для мяне зусім дастаткова, каб адразу з павагай паглядзець на майго новага знаёмага.

Што ён за чалавек, гэты хлопец, якому падначалена магутнейшая сіла прыроды, утаймаваная і схаваная тут, у звыштрывалым мяшку са свінцу і бетону? Гонаў расказвае мне пра крытычную масу і хуткія нейтроны, я з разумным выглядам ківаю галавой, хоць разумею, напэўна, дзесятую частку з таго, што хоча растлумачыць субяседнік. Справа ў тым, што ў гэты момант я не думаю пра хуткія нейтроны—я проста слухаю Аляксандра. І думаю пра тое, як непадобны ён на «літаратурнага» фізіка, дакладней, на той вобраз чалавека, які мае адносіны да «атамаў», што складваецца ў нас пад уплывам некаторых мастацкіх твораў, прысвечаных людзям навукі.

Нічога гэтага я не шукаю ў Аляксандра, таму што бачу, адчуваю: і сам ён, напэўна, не без іроніі ставіцца да ўсялякага роду арэолаў, німбаў і да таго падобных дэкарацый вакол звычайнай у прынцыпе галавы чалавечай. Нават у мастацкай творчасці ён не церпіць падобнага фальшу. Знаўца і аматар добрай рэжысуры, Саша недаўменна паціскае плячыма, калі размова заходзіць пра Гусева з «Дзевяці дзён аднаго года»:

— І навошта яго падсунулі пад дозу, невядома... Дзеля прыгажосці і большага драматызму? Зусім неабавязкова было яму лезці пад паток—усё, што трэба, у нас паказваюць прыборы...

І гэта — не цынізм занадта цвярозага рацыяналіста, які адмаўляе подзвіг у імя навукі. Цяжка сцвярджаць, толькі мне здаецца, Гонаў здольны на самаахвярнасць, на подзвіг, але калі гэта сапраўды будзе прадыктавана неабходнасцю.

Чаму мне так здаецца? Таму, што ён ужо здзейсніў аднойчы подзвіг. Можна, бадай, назваць гэта іменна так, хаця размова ідзе ўсяго толькі аб здачы экзамену. Але ўся справа ў тым, які экзамен.

Звычайных экзаменаў Аляксандру за перыяд вучобы ў інстытуце прыйшлося здаць не менш паўсотні, але гэты адзін, бадай, каштаваў усіх. На завочным аддзяленні энергафака Беларускага політэхнічнага інстытута, які закончыў Гонаў, працуючы спачатку электрыкам на будаўніцтве рэактара, а потым інжынерам у службе фізічных вымярэнняў, не рыхтуюць спецыялістаў таго профілю, па якому малады інжынер павінен быў цяпер працаваць на рэактары. І вось адразу ж пасля абароны дыплома яму прапануюць рыхтавацца да экзамену на пасаду начальніка змены — іншымі словамі, асвоіць па сутнасці зусім новую спецыяльнасць, ды яшчэ якую! Ядзерная фізіка, фізіка рэактара, кантрольна-вымяральная электроніка... І ўсё гэта начальніку змены патрэбна ведаць не як-небудзь, а дасканала ў той ступені, у якой справа датычыць рэактара.

Ніхто ў наш рэальны век зорак з неба не хапае. Той чалавек, які потым прымаў у Гонава экзамен, сказаў мне, што на засваенне ўсёй гэтай праграмы звычайна патрабуецца годпаўтара. Аляксандру ж спатрэбілася тры месяцы, каб зрабіць немагчымае магчымым. Толькі прыйшлося адмовіцца ад многага, у тым ліку і адпачынку, такога неабходнага пасля абароны дыплома, і ад «лішніх» гадзін сну...

Аляксандр Гонаў яшчэ не склаўся як вучоны, але іменна ў навуцы бачыць ён сваю будучыню. І многае з таго, што неабходна чалавеку навукі, заўважаюць у маладым начальніку змены яго старэйшыя таварышы. Акрамя тых якасцей, індыкатарам якіх з'явіўся экзамен, «шэф» Гонава прыкмеціў характэрную асаблівасць гэтага хлопца—ён задумваецца над зададзеным яму пытаннем нават тады, калі адказ, здаецца, не павінен выклікаць ніякіх сумненняў і калі іншы на яго месцы «выстрэльвае» гэты адказ імгненна. Але тут уся справа ў тым, што для школьніка два на два заўсёды чатыры, а для вучонага—не заўсёды. І ўласцівасць заўжды варушыць мазгамі, нават пры вырашэнні праблемы «колькі будзе два на два»—даволі пэўная прыкмета даследчых задаткаў у чалавека.

У кожнага, хто вырашыў працаваць у навуцы, павінна быць «свая» ідэя. Ёсць яна і ў Аляксандра, хаця паняцце «працаваць у навуцы» ў прыстасоўна да яго гучыць пакуль што некалькі адносна. Дакладна гэтая ідэя, бадай, яшчэ не фармулюецца, але сутнасць яе ў даследаванні ўплыву радыёактыўнага выпраменьвання на электратэхнічны ў ўласцівасці праваднікоў. Праблема не высмактана з пальца—з ёй увесь час сутыкаюцца людзі, якія працуюць на рэактарах, і сам Аляксандр у тым ліку. Скажам, ніякім тэрмометрам не вымерыш тэмпературу ў актыўнай зоне пры інтэнсіўным ядзерным дзяленні, а паказанням яго замяняльнікаў, што дзейнічаюць па прынцыпу тэрмапары, цяжка верыць,—яны «хлусяць», проста кажучы, таму што радыяцыя, безумоўна, нейкім чынам уплывае на ўласцівасць матэрыялу. Але як іменна і ў якой ступені—гэтыя пытанні ўсё яшчэ застаюцца пытаннямі, і трэба шукаць на іх адказы. Магчыма, не менавіта на гэтыя пытанні ўдасца знайсці адказ Аляксандру, а на нейкія іншыя, але калі ўлічыць тую ісціну, што вялікія адкрыцці часцей здзяйсняюцца на мяжы навук, электрыку Гонаву не дарэмна прыйшло ў галаву «пакапацца» ў ядзернай фізіцы...



□

Пасля змены мы ідзём з ім праз радкаваты лясок дадому, у гарадок «рэактаршчыкаў» з простай і крыху паэтычнай назвай «Сосны», і размаўляем зусім ужо не аб крытычнай масе і хуткіх нейтронах, а проста так, аб усім. І ў гэтай гутарцы я яшчэ раз знаходжу пацвярджэнне той думкі, якая ўзнікла пры самым першым знаёмстве з Аляксандрам,—што чалавек гэты, знешне падобны на Кулікова з «Дзевяці дзён аднаго года», відаць, і ўнутрана ў нечым падобны да свайго выпадковага двайніка. Прынамсі, ён гэтак жа проста ставіцца да сябе і да іншых, не накрываецца, накшталт ідэальных герояў не вельмі ідэальных п'ес, тэхнічнымі часопісамі замест коўдры і, аказваецца, чытае «Новый мир» і «Октябрь» не з меншай цікавасцю, чым «Науку и жизнь». І, акрамя ўсяго іншага, любіць балет, добрыя кінафільмы і баскетбол—апошняе ўжо як спартсмен-першаразраднік.

Потым мы ідзём моўчкі. Не ведаю, якія думкі займаюць Аляксандра, а я думаю пра тое, што вось надышоў час, калі хлопцы, якія нарадзіліся перад самай вайной і былі яшчэ занадта малыя ў жніўні сорак пятага, калі ўзарвалася першая атамная бомба, — гэтыя хлопцы ўжо садзяцца за пульт кіравання ядзернай рэакцыяй. І бацькі, маці, дзяды—тыя самыя, што калісьці рабілі рэвалюцыю, а потым вачавалі і галадалі за яе, не паспеўшы пры гэтым авалодаць прамудрасцямі лагарыфмічных раўнанняў і тэорыі адноснасці,—яны раптам робяцца на дзіва далікатнымі, стараючыся не задаваць сыну, які пайшоў «па атамнай справе», лішніх пытанняў пра яго работу. Адчуваюць, што вельмі важнай справай займаецца іх хлопец. І, напэўна, непакояцца. І, вядома ж, ганарацца...

Аркадзь КАРЭЛІН.

Дарогамі пошукаў — ЗАВОЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РАБОТНІКАЎ КУЛЬТАСВЕТУСТАНОЎ

ЛЕТАПІС РАЁНА

Расказаць сваім землякам гісторыю роднага краю — такую задачу паставіла перад сабою ініцыятыўная група краязнаўцаў, якую ўзначалілі ўдзельнікі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ветэраны працы, партыйныя работнікі, журналісты, работнікі культуры, выкладчыкі гісторыі Калінкавіцкага раёна.

Раённы аддзел культуры распрацаваў і выпусціў масавым тыражом палажэнне аб эстафеце «Летапіс раёна». Мэта эстафеты — сабраць і сістэматызаваць матэрыялы па гісторыі калгасаў, саўгасаў і прадпрыемстваў раёна, паказаць эканамічны і культурны рост горада і вёскі за гады Савецкай улады.

Для кіраўніцтва эстафетай быў створаны штаб, які складаў маршруты, канцэнтраваў матэрыялы, што паступалі ад устаноў культуры, вырашаў усе арганізацыйныя пытанні і падводзіў вынікі.

Старт эстафеты быў дадзены ў верасні мінулага года. Яна ішла адначасова па 13 маршрутах (у кожным маршруце па чатыры — пяць культасветустаноў). Да гэтага паходу рыхтаваліся больш трох месяцаў.

Цікавы альбом «Гісторыя вёскі Нахаў» зрабілі загадчыца і актывісты мясцовай бібліятэкі. Падобныя альбомы падрыхтавалі многія ўстановы культуры раёна.

Сабраныя матэрыялы шырока выкарыстоўваюцца ў мэтах камуністычнага выхавання працоўных, асабліва моладзі.

У час правядзення эстафеты для працаўнікоў вёскі прачытана больш ста дакладаў па гісторыі калгасаў і саўгасаў. У кожнай установе культуры быў праведзены тэматычны вечар — «Наша вёска расце і прыгажэе».

Эстафета дала штуршок да стварэння новых калектываў мастацкай самадзейнасці. Работнікі культуры сабралі багаты краязнаўчы матэрыял і напісалі гісторыю 56 населеных пунктаў раёна. Гэты матэрыял цяпер вывучаецца, і найбольш значныя падзеі будуць запісаны ў гісторыю раёна.

У аддзеле культуры сёння ляжыць на стале больш 70 маляўніча аформленых альбомаў.

Многае зрабіла Калінкавіцкая раённая бібліятэка. Яе работнікі распрацавалі метадычныя парады, як правесці вусны часопіс і тэматычны вечар, прысвечаныя гісторыі роднага краю; далі рэкамендацыі, як абсталяваць краязнаўчы куток, скласці картатэкі; падабралі рэкамендацыйны спіс літаратуры для краязнаўцаў.

У чытальнай зале раённай бібліятэкі аформлены куток «Вывучай свой край». Акрамя парад тут знойдзеш і картатэку артыкулаў з часопісаў і газет, прысвечаных Калінкавіцкаму раёну. У картатэцы выдзелены рубрыкі: «Нашы падарункі 50-годдзю Савецкай улады», «Будаўніцтва і добраўпарадкаванне населеных пунктаў», «Што пішуць пра наш раён», «Культурна-асветная работа», «Брыгады камуністычнай працы» і іншыя.

Заведзены папкі выразак газетных матэрыялаў на тэмы: «Перадавікі калгасна-саўгаснай вытворчасці», «Творчасць нашых землякоў», «Эстафета культуры Калінкавіцкага раёна». У раённай бібліятэцы работнікі сельскіх устаноў культуры могуць атрымаць кваліфікаваную метадычную параду па пытаннях краязнаўства.

Раённая газета «За камунізм» пачала друкаваць на сваіх старонках найбольш цікавыя матэрыялы па гісторыі вёсак раёна, сабраныя ў час эстафеты культуры.

Вопыт Калінкавіцкага раённага аддзела культуры і яго ініцыятыўнай групы па вывучэнню і напісанню гісторыі вёсак падхапілі ўсе раёны Гомельшчыны.

Анатоль СТАНКЕВІЧ,
метадыст Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці.

ШКОЛА ПРАПАГАНДЫСТАЎ КНІГІ

Работнікі нашай бібліятэкі адкрылі ў Слонімскім раёне дзве школы прапагандыстаў кнігі. Адна з іх створана на базе Плецянецкай сельскай бібліятэкі, а другая — пры Дзераўноўскім Доме культуры.

Могуць запытацца: чаму і пры клубнай установе адкрыта такая школа? А справа ўся ў тым, што загадчыку клуба і яго актывістам ніяк нельга абысціся без кнігі, калі, скажам, рыхтуецца лекцыя, гутарка, літаратурны вечар, вечар пытанняў і адказаў, ставіцца спектакль і г. д. Больш таго, у кожным клубе ёсць кнігі. Фонд гэтай бібліятэкі часам складае пяць — сем тысяч тамоў. І клубнаму работніку неабходна ўмець прапагандаваць грамадска-палітычную, мастацкую, сельскагаспадарчую, навукова-атэістычную літаратуру.

Школы прапагандыстаў кнігі адкрыты на базе перадавых устаноў культуры. Тут кожны месяц праходзяць вучобу 58 чалавек.

Вось як праходзілі адны з апошніх заняткаў у школе пры Плецянецкай сельскай бібліятэцы. Яе загадчык К. Рубановіч расказаў прысутным пра свой вопыт. Асаблівую цікавасць выклікалі формы і метады работы з сельскагаспадарчай літаратурай. Затым прысутныя праходзілі практычныя заняткі, якімі кіраваў загадчык бібліятэкі - перасоўкі Л. Шпак. У вёсцы Раўтовічы бібліятэкары і клубныя работнікі працавалі на пункце выдачы кніг, падбіралі літаратуру для жывёлаводаў, механізатараў, пал志водаў, будаўнікоў.

Мы стараемся, каб школы прапагандыстаў кнігі абагульнялі вопыт работы лепшых бібліятэк раёна, збіралі і ўкаранялі ў практыку ўсё новае і перадавое, што ёсць у дзейнасці ўстаноў культуры рэспублікі.

Нядаўна школа пры Дзераноўскім сельскім Доме культуры падрыхтавала і правяла тэматычны вечар «Хвала рукам, што пахнуць хлебам». На гэта паказальнае мерапрыемства былі запрошаны загадчыкі клубаў і бібліятэк раёна. Работнікі культуры зрабілі аналіз тэматычнага вечара, падказалі яго арганізатарам, як лепш праводзіць ушанаванне працы перадавых людзей калгаснай і саўгаснай вёскі.

Першыя крокі дзейнасці школ прапагандыстаў кнігі паказваюць, што знойдзена добрая форма вучобы работнікаў сельскіх бібліятэк і клубаў.

Л. ТРЫПУЦЬ,
загадчыца Слонімскай раённай бібліятэкі.

Ад рэдакцыі:

Выступленнямі метадыста Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці А. Станкевіча і загадчыцы Слонімскай раённай бібліятэкі Л. Трыпуць «Літаратура і мастацтва» завяршае завочную канферэнцыю работнікаў культасветустаноў.

На працягу апошніх двух месяцаў на старонках газеты выступілі многія культармейцы рэспублікі. Яны расказалі пра ініцыятыўныя формы і метады работы. Трэба, каб гэтае новае, перадавое, што нарадзілася за апошні час у рабоце нашых клубаў, бібліятэк, музеяў, калектываў мастацкай самадзейнасці, усталявалася ў практычнай дзейнасці работнікаў культуры рэспублікі.

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» будзе і надалей друкаваць на сваіх старонках матэрыялы, прысвечаныя творчым пошукам нашых культармейцаў.

Каця Бандаровіч — актыўная ўдзельніца самадзейнасці Шылавіцкага сельскага клуба Слонімскага раёна. Рабочыя саўгаса заўсёды цёпла сустракаюць яе з'яўленне на сцэне. Дзяўчына сардэчна спявае народныя і сучасныя лірычныя песні.

Нядаўна шылавіцкія артысты гулялі на Каціным вяселлі. Аднавяскоўцы горача павіншавалі маладых Кацю Бандаровіч і Валодзю Гурскага з вялікім святам у іх жыцці, зрабілі ім падарунак.

На здымку: загадчыца клуба Марыя Канстанцінаўна Мацкса падносіць маладым кветкі і падарунак.

Фота **А. ПЕРАХОДА (БЕЛТА).**

ПА-АМАТАРСКУ? НЕ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНА!

Некалькі гадоў назад пры Доме культуры чыгуначнікаў горада Магілёва пачаў сваю работу фотаклуб. Яго члены выпускалі фотагазеты, арганізоўвалі выстаўкі, супрацоўнічалі ў друку.

Аднойчы член клуба Васіль Георгіевіч Аляксейчык прынёс на занятки зняты ім фільм, а Карл Ісакавіч Янавіцкі — праектар. Пасля прагляду стужкі нарадзілася думка стварыць аматарскую кінастудыю. Праўленне Дома культуры падтрымала гэтую ініцыятыву.

Пачынаючыя кінааматары адразу ўзяліся за пастаноўку ігравога фільма — найбольш цяжкага жанру «малога кіно». Вырашылі здымаць навелу «Бярозавы сок» па сцэнарыі А. Кандрусевіча і А. Рагоўскага. Да ўсяго даводзілася даходзіць самім. Колькі працы і вынаходлівасці трэба было здымачнай групе, рэжысёру-аператару Пятру Аляксандравічу Маліноўскаму, каб зрабіць гэты фільм! Колькі бяссонных начэй правялі энтузіясты ў лабараторыі і за мантажным сталом, перш чым фільм з'явіўся на экране.

Першае месца на абласным аглядзе аматарскіх фільмаў, другая рэспубліканская прэмія — вось вынік гэтай цікавай работы. Але галоўнае — студыйцы паверылі ў свае сілы, сілы сваіх таварышаў. «Бярозавы сок» з'явіўся для іх добрай школай майстэрства.

Кінастудыя цяпер пашырылася, папоўнілася новай апаратурай. Вырас і творчы калектыў яе — сцэнарысты, гукатэхнікі, мантажоры, хімікі. Пад кіраўніцтвам больш вопытных таварышаў яны вывучаюць тэхніку, выконваюць поўную работу па стварэнню фільма.

А павучыцца ёсць у каго. З першага дня ў рабоце студыі прымае ўдзел інжынер аддзялення чыгункі Пётр Аляксандравіч Маліноўскі. Ім напісана большасць сцэнарыяў кінанарысаў і часопісаў. Пётр Аляксандравіч кіруе сцэнарнай групай, з'яўляецца рэжысёрам і аператарам. Увесь вольны час аддае кіно і старэйшы рэвізор-інструктар Магілёўскага аддзялення чыгункі Васіль Георгіевіч Аляксейчык.

Вялікія цяжкасці звязаны з агучваннем фільма. Заводскай кінааматарскай апаратуры для запісу гукаў на вузкую плёнку пакуль што няма, і яе даводзіцца канструяваць самім. З гэтай задачай паспяхова спраўляецца выкладчык сярэдняй школы № 24 Іван Іванавіч Карнасёнак. Хутка ён закончыць мантаж арыгінальнай прыстаўкі, якая дазволіць сінхранізаваць гук і адлюстраванне, што значна пашырыць нашы творчыя магчымасці.

Многімі сваімі поспехамі чыгуначнікі абавязаны Адаму Арцёмавічу Рагоўскаму. Майстэрства і дваццацігадовы вопыт фота- і кінааматара ён ахвотна перадае навічкам, памагае ім і патрабуе ад іх дысцыпліны і стараннасці ў рабоце. А. Рагоўскі таксама чытае лекцыі па праграме аператараў аматарскіх студый, распрацаванай Цэнтральным Домам народнай творчасці.

На студыі цяпер гарачыя дні. Здымаецца кіначасопіс, прысвечаны XXIII з'езду партыі, чарговы «Калейдаскоп» — часопіс аб працы і адпачынку магілёўскіх чыгуначнікаў. На чарзе — ігравы фільм «Рукі». На мантажным століку — матэрыял пра аматараў зімовага плавання. Заўтра гэтыя кадры будуць адпраўлены ў Мінск: аматарская кінастудыя — нештатны карэспандэнт Беларускага тэлебачання. Толькі за апошні час чыгуначнікі знялі больш 20 сюжэтаў для тэлебачання.

...Вечарамі ў акне кінастудыі гараць яркі агеньчык — агеньчык творчасці.

Анатоль КУКШЫНСКІ.

Хойніцкая музычная школа працуе другі год. Тут вучацца 52 хлопчыкі і дзяўчынкі.

У школе працуюць маладыя выкладчыкі, якія ўмела выхоўваюць юных музыкантаў.

На гэтым здымку вы бачыце выкладчыка Генадзя Цішкевіча на занятках па класу баяна з вучаніцай Тамарай Хацько.

Фота **Л. ЛЯВОНЕНКІ.**

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

ДЫРЫЖЫРУЕ БАРЫС РАЙСКІ

«Слухайце выступленне канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Барыса Райскага...». Гэтыя словы гучаць па радыё не менш дзесяці разоў на месяц. І гучаць не толькі па рэспубліканскім, але і па усесаюзным радыё, перадаюцца замежнымі радыёстанцыямі. Назву аркестра і прозвішча яго кіраўніка мы сустракаем на шматлікіх патэфонных пласцінках, у філарманічных афішах, чуем на канцэртах у рабочых і калгасных клубах, дамах культуры.

У рэпертуары аркестра побач з эстраднай мініяцюрай можна сустрэць вялікі сімфанічны твор, побач з песняй — кантату ці мантаж оперы. За апошнія гады, напрыклад, запісаны на плёнку ў выкананні аркестра такія буйныя творы беларускай музыкі, як мантаж опер П. Падкавырава «Павел Карчагін» і Я. Глебава «Твая вясна», кантаты М. Аладава «Сціплы і просты» і І. Лучанка «Курган», сюіта Л. Смялкоўскага для салістаў, хору і аркестра «На Кубу прыходзіць дзень». У выкананні аркестра можна пачуць «Егіпецкі балет» Луіджыні, сюіту Грыга «З часоў Гольдберга», асобныя п'есы Чайкоўскага, Рубінштэйна, Арэнскага і іншых кампазітараў-класікаў.

Цалкам апраўдвае калектыў і другую частку сваёй назвы — «эстрадны». Аснова рэпертуару аркестра — эстрадная музыка кампазітараў Беларусі, братніх рэспублік Савецкага Саюза, краін сацыялізма, а таксама лепшыя ўзоры заходняга джаза, музыкі народаў Лацінскай Амерыкі.

Такі вялікі «рэпертуарны дыяпазон» — даволі рэдкі ў сучасных аркестравых калектывах, якія, нібы высокай сцяной, аддзяляюцца адзін ад аднаго сваімі творчымі імкненнямі, сваімі назвамі — «сімфанічны» і «эстрадны». Рэдкае выключэнне — нешматлікія «сімфаджазы», але і яны маюць спецыфічны рэпертуар, своеасаблівую творчую накіраванасць. Толькі тры—чатыры аркестравыя калектывы ў Савецкім Саюзе ўдала спалучаюць у рэпертуары складаную сімфанічную музыку, эстрадныя творы савецкіх кампазітараў, зарубежны джаз.

Адным з такіх калектываў і з'яўляецца канцэртна-эстрадны аркестр Беларускага радыё і тэлебачання, у складзе якога каля чатырох дзесяткаў артыстаў. Даволі вялікая струнная група (скрыпкі, альты, віяланчэлі, кантрабасы) і такія чыста «сімфанічныя» інструменты, як арфа, флейта, габой, кларнет, фагот, валторна, чалеста і іншыя, дазваляюць калектыву разам з невялічкай дадатковай колькасцю музыкантаў выконваць самыя разнастайныя творы класічнага рэпертуару. Пяць саксафонаў, чатыры трубы, чатыры трамбоны, раяль, акардэон, гітара, электраарган, вібрафон, поўны набор ударных і іншых джазавых інструментаў разам са струннымі могуць раскрыць партытуру любога твора савецкай ці зарубежнай эстраднай музыкі.

Аркестр параўнаўча яшчэ малады, але паспеў ужо набыць станоўчыя выканаўчыя традыцыі і досыць высокае прафесіянальнае майстэрства. Гэта адбылося з прыходам у калектыў некалькі гадоў назад дырыжора Барыса Іпалітавіча Райскага — музыканта вялікай культуры, які валодае добрым густам і абсалютным слыхам. У надзвычай кароткі тэрмін ён дамогся амаль бездакорнай чысціні інтанацыі, гукавой раўнавагі між асобнымі групамі аркестра, тэхнічнай дакладнасці выканання.

Трэба сказаць, што паміж дырыжорамі, як і паміж аркестравымі калектывамі, існуе своеасаблівы неафіцыйны падзел на оперных, сімфанічных, эстрадных. Напэўна, амаль немагчыма ўбачыць на чале эстраднага аркестра дырыжора опернага тэатра ці за дырыжорскім пультам сімфанічнага аркестра — кіраўніка эстраднага ансамбля. А вось Б. Райскі — адзін з нямногіх музыкантаў, які парушыў гэты няпісаны закон, і парушыў вельмі ўдала. Пра гэта якраз і сведчыць рэпертуар аркестра.

Як жа здарылася, што ў адным чалавеку так нечакана гарманічна зліліся зусім процілеглыя музычныя напрамкі, жанры і стылі? Справа тут, відаць, не ў адных толькі музычных здольнасцях і схільнасцях, але і ў выхаванні, у самім творчым жыцці музыканта.

Сваю прафесію Б. Райскі атрымаў у спадчыну ад бацькі-дырыжора. З дзіцячых гадоў яго акружала музыка. Яна гучала ў доме бацькоў, пра яе там гаварылі, яе з асалодай слухалі і выконвалі ў хатніх канцэртах. Хлопчык бываў амаль штодзённа ў оперным тэатры. У дзяцінстве ён быў добра знаёмы з цікавым дырыжорам А. Пазоўскім.

Да дзесяці гадоў Б. Райскі займаўся музыкай з бацькам, а потым вучыўся ў музычным вучылішчы па класу віяланчэлі прафесара Шпільмана. З пятнаццаці гадоў юнак паныннае іграць у камерных ансамблях, удзельнічае ў хатніх трыо, квартэтах і квінтэтах, а яшчэ праз два—тры гады становіцца артыстам досыць вялікага ансамбля ў кінатэатры і сімфанічнага аркестра.

Першымі дырыжорскімі спробамі Б. Райскага былі сімфанічныя канцэрты ў філармоніі, пастаянная работа ў студыі грамзапісу і ў разнастайных эстрадных калектывах.

У 1946 годзе вакол Б. Райскага згрупаваўся самастойны эстрадны аркестр, які меў даволі высокія прафесіянальныя якасці, і праз год быў залічаны ў штат Кемераўскага абласнога канцэртна-эстраднага бюро. Аб рэпертуары гэтага аркестра расказваюць шматлікія друкаваныя праграмы гастрольных паездак па розных гарадах Савецкага Саюза. Тут можна знайсці ўрыўкі са «Спячай прыгажуні» Чайкоўскага і «Капэліі» Дэліба, «Камарынскую» Глінкі і «Лёгкую кавалерыю» Зупэ, «Палёт чмяля» Рымскага-Корсакава і «Марш энтузіястаў» Дунаеўскага, музыку з аперэт і песні савецкіх кампазітараў, аркестравыя мініяцюры кампазітараў-класікаў, савецкую і зарубежную эстрадную музыку. Праз дзесяць—дванаццаць гадоў малады калектыў асталяваўся ў Беларускім цыркавым калектыве Мінска. За гэтыя гады ў аркестры змянілася нямала выканаўцаў, але дырыжор здолеў не толькі захаваць добрыя выканаўчыя традыцыі калектыву, але і замацаваць і пашырыць іх. І не дзіва, што аркестр з першых жа выступленняў прыйшоўся да спадобы наведвальнікам цырка і атрымаў самыя станоўчыя водгукі прэсы.

Рознабаковая дырыжорская дзейнасць, праца ў сімфанічных канцэртах, цыркавых і эстрадных калектывах памагла Б. Райскаму стаць музыкантам з надзвычай шырокім творчым дыяпазонам. Менавіта гэта і паслужыла прычынай для яго запрашэння на пасаду галоўнага дырыжора канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага радыё і тэлебачання. Сёння стала відавочным, што гэтае запрашэнне цалкам апраўдала сябе.

Калі яшчэ некалькі гадоў назад беларускай эстраднай музыкі фактычна не існавала, а ўсе яе «дасягненні» складаліся з некалькіх больш-менш удалых песень ды з дзесятка невялічкіх п'есак для аркестра і эстраднага квартэта, дарэчы, напісаных досыць прымітыўна, дык цяпер творы беларускіх кампазітараў у гэтым жанры загучалі шырока і ўпэўнена. І яскравым прыкладам гэтага можа служыць хаця б тое, што ўжо ў сакавіку 1963 года Саюз кампазітараў Беларусі здолеў правесці пленум, прысвечаны песні і эстраднай музыцы, даволі насычаны па канцэртных праграмах.

Развіццё эстрадных жанраў беларускай музыкі тлумачыцца не толькі запатрабаваннямі слухачоў, але і тым, што нашы кампазітары атрымалі ў асобе канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага радыё добрую выканаўчую базу і сапраўдную творчую лабараторыю. Менавіта дзякуючы гэтай лабараторыі з канцэртных эстрад і па радыё загучалі такія творы, як фантазія на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка» Я. Глебава і яшчэ некалькі дзесяткаў яго аркестравых п'ес і песень, новыя эстрадныя творы Д. Камінскага, М. Шнейдэрмана, І. Кузняцова, Э. Тырманд, Ул. Чараднічэнкі, Д. Смольскага, І. Лучанка, Ю. Семянякі, Р. Бутвілоўскага і многіх іншых кампазітараў.

Трэба сказаць, што спецыяльных падручнікаў па інструментоўцы для эстраднага аркестра, джаза ў нашай музычнай літаратуры не існуе. І памагчы кампазітару ў гэтым выпадку можа толькі вопытны спецыяліст. А такім спецыялістам якраз і з'яўляецца Б. Райскі, і яшчэ не было выпадку, каб ён адмовіў каму-небудзь у дапамозе.

Дарэчы, гэтую добразычлівую дапамогу дырыжор аказвае не толькі кампазітарам-прафесіяналам, якія працуюць у галіне эстраднай музыкі, але і іх калегам з самадзейнасці. Так у рэпертуары аркестра з'явіліся аркестравыя п'есы і песні кампазітараў-аматараў Ю. Цырука, Б. Фёдарава, Л. Молера, І. Нагаўкіна, М. Сакалова і многіх іншых.

У гэтай сувязі хочацца сказаць, што даўно наспела пара арганізаваць пры Саюзе кампазітараў секцыю эстраднай музыкі, якая магла б згрупаваць вакол сябе ўсіх, хто мае жаданне і творчыя магчымасці працаваць у эстрадных жанрах музыкі, на жаль, так незаслужана занядбаных у рэспубліцы.

З прыходам у аркестр радыё Б. Райскага рэпертуар яго ўзбагаціўся. Вырасла кола салістаў, якія актыўна супрацоўнічаюць з калектывам. Сярод іх — З. Бабій, І. Сарокін, В. Чарнабаеў, В. Ганчарэнка, Т. Ніжнікава, Т. Шымко, А. Саўчанка і іншыя.

З'яўляючыся аўтарам музыкі для кіно, тэлебачання, цырка, выдатным інструментоўшчыкам і выканаўцам на многіх аркестравых інструментах, Б. Райскі з бездакорным густам і прафесіянальным майстэрствам «ставіць» многія музычныя творы, самыя разнастайныя па характары і жанрах. Ён прызнаны майстар эстраднай аркестравай музыкі, інтэрпрэтатар многіх новых твораў нашых кампазітараў.

Аркестр пад яго кіраўніцтвам робіць складаныя і смелыя эксперыменты гуказапісу і нярэдка дасягае цікавых вынікаў. У якасці прыкладу можна прывесці так званы «падвойны запіс», калі выкананне асобных аркестравых груп запісваецца на магнітафонную плёнку, потым яшчэ раз паўтараюць запіс на гэтую ж плёнку, а яна ў сваю чаргу служыць «фанаграмай» для накладання гучання іншых груп аркестра. І ў выніку такіх складаных намаганняў атрымоўваецца стэрэафанічны запіс, у якім кожная з груп аркестра гучыць ярка, выразна, дасканала, а ўвесь музычны твор набывае зусім новыя мастацкія якасці.

Расце папулярнасць першага Беларускага эстраднага аркестра, расце кола яго сяброў. Наспеў час пашырыць межы гастрольных паездак калектыву. І нельга не вітаць таго, што ў бліжэйшы час аркестр прыме ўдзел у вялікім гастрольным падарожжы па Уралу і Сібіры. Хочацца спадзявацца, што калектыў на чале са сваім таленавітым кіраўніком заваюе любоў і павагу грамадскасці Омска, Новасібірска, Свярдлоўска і Кемерава, куды ён выязджае для ўдзелу ў фестывалі беларускай культуры.

З. НАЛІБОЦКІ.

НАШ НЯЗРУЧНЫ СТОЛ

пародыі-эпіграмы-усмешкі

Макар ПАСЛЯДОВІЧ

ЧАЛАВЕК І ПРАСПЕКТ

(Уладзімір КАРПАЎ)

Што паробіш, галоўны архітэктар горада Васіль Пятровіч Юркевіч, як гэта ні дзіўна, быў чалавекам!

Дарэмна прайдзісвет і нахабны паклёпнік Понтус сцвярджаў адваротнае, абвінавачваючы (зразумела, беспадстаўна!) Васіля Пятровіча ва ўсіх смяротных грахах. Дарэмна раззвоньваў па наваколлю, што «галоўны» астыў да сваёй нявернай палавіны і пачаў красамоўна пагладаць на былую партызанскую разведчыцу Валю, мілую слаўную дзяўчыну, якую Кастусь Алешка з такім душэўным уздымам калісьці нёс на сваіх магутных руках праз балота... Але чамусьці мала хто з аднаўленцаў сталіцы верыў прайдзісвету і нахабніку Понтусу.

І не верылі, відаць, таму, што Понтус быў тут, як гаворыцца, выпадковай асобай. Апрача таго, людзей насцярожылі некаторыя яго паліятыўныя прапановы на пасяджэнні гарсавета: не ствараць, эканомячы кожную капейку, Мінск нанава, а прыстасоўваць для жылля напаўразбураныя каробкі і ставіць драўляныя фінскія домікі замест шматкватэрных і шматпавярховых камяніц. Тут вядомы многім дзесяткам тысяч чытачоў Юркевіч ужо не мог стрымацца. Падахвочаны ў дадатак такімі мілымі і пяшчотнымі позіркамі Валі, якая таксама прысутнічала на гэтым пасяджэнні, ён рынуўся ў атаку.

Бож-жа мой! Як збялеў Понтус! Як затросся яго новенькі, у зялёныя гарошыны, гальштук на жылаватай і голай, нібы ў амерыканскага грыфа, шыі! Працсей кажучы, шыі звычайнага сцярвятніка, што любіць паласавацца звычайнай падлай...

Бож-жа мой! Гэта была незвычайная па напалу баталія! І калі Понтус забыўся ад страху на ўвесь свет, дык Васіль Пятровіч, як гэта ні дзіўна, памятаў усё да самага каліва: і дарэвалюцыйныя купецкія лабазы ў Хвалынску Самарскай губерні, дзе кожны завулак патыхаў алеем, і скрываўленыя гітлераўцамі берагі Нямігі, якія год за годам паласкалі вясення лівні, і тое, што гораду, які ён любіў, як самога сябе, неўзабаве стукне дзевяцьсот год! Якая, бож-жа мой, слаўная мінуўшчына, натхнёная сучаснасць і надзвычай багатая па сакавітасці фарбаў будучыня!

Каб гэты прайдзісвет і нахабнік Понтус зазірнуў у трапяткую душу Юркевіча, ён бы адразу здрыгануўся і нават самлеў бы. Але не дадзена было яму, як пісаў Мікалай Васільевіч Гогаль у паэме «Тарас Бульба», бачыць сваю будучыню. Бачыў яе толькі Васіль Пятровіч, і на яго з павагай і надзеяй пазіралі ўсе члены гарадскога Савета. Але даражэй за ўсё на свеце быў для Юркевіча позірк спагадных, заканых вачэй Валі. Малады і задзірыста прываблівы, гэты позірк, здавалася, мог пераадолець сілу зямнога прыцягнення і паімчаць, нібы ракета касманаўтаў, да самых далёкіх зорак.

Юркевічу, у сваю чаргу, хацелася таксама адказаць на гэты неўтрапёны сардэчны заклік з грубаватай, але цёплай мужчынскай ласкай: «Слаўная ты мая дыверсантка! Кінем усё, пабяжалі! На самую вяршыню стагоддзя перавалу! Каля якой бушуюць вясеннія лівні! Абсалютна!..»

Хоць гэта былі адны толькі думкі, Валя, аднак, іх зразумела адразу і ў сваю чаргу адказала думкамі:

«Пабяжалі, мой любы, мой дарагі чалавек, на праспект! Дабівай гэтага шкодніка Понтуса, які хацеў загрувасціць наш шматпакутны горад драўлянымі фінскімі хацінамі. Ты першы разгадаў гэты каварны понтусаўскі план. Цяпер наш горад стаў прыгажэйшы, як быў ён да вайны! Зірні, любы, на яго дзівосныя дамы, узнёслыя кварталы зіхотныя праспекты. У іх велічных і непаўторных абрысах, як гэта ні дзіўна, відаць і часцінка тваёй самаахвярнай і высакароднай душы, Вася!

Ты прабач, але, як гэта ні дзіўна, я кахаю цябе, Вася!

Няхай наш любімы горад, узняўшыся яшчэ на адзін перавал стагоддзя, будуецца вечна!»

ПЕРАПЫНЕНАЯ КАМАНДЗІРОЎКА

(Раман САБАЛЕНКА)

Хай твой двор!.. Такога выбуху Макар Шыянок зусім не спадзяваўся ад сваёй ціхай і сарамяжай Марылькі. Дый і сама Марылька, відаць, разгледзелася, што завельмі крута, нават неяк не палюдску, як гавораць на Брагіншчыне, павяла свой грозны рэй. Гэта Макар зразумеў, калі Марылька пачала першай гаварыць яму ў той дзень усялякія ласкавыя словы.

Хай твой двор!.. Жаночае сэрца — сапраўды цёмны лес. Пакуль ён, Макар Шыянок, рагазінскі галетнік, вучыўся ў мілай настаўніцы Анастасіі Паўлаўны, прагна лавіў смелае слова франтавіка-камуніста Пракопа Касянка, каб пасля скончыць рабфак і пайсці ў жыццё, Марылька таксама вунь як падрасла, вунь як вылюдзела. Рагазінскія хлопцы пачалі хадзіць за ёю вунь якімі чародамі.

Марылька, аднак, добра ўжо разбіралася, хто сапраўдны чалавек, а хто самы звычайны вісус. З усёй пляймы ўхажораў яна абрала толькі аднаго — Макара Шыянка, хоць ён безразважна ажаніўся з нявартай яго жанчынай. Іншае дзяўчо адразу б раззлавалася і прыняло б сватоў абы ад якога хлопца. Марылька не толькі не разгневалася на Макара, але яшчэ і спачувала яму ў яго няўдалым сямейным жыцці. То ж трэба думаць, нейкая гадаўка і круціхвостка падабрала пад свой ступак вунь якую чыстую, вунь якую далікатную душу!

Хай твой двор!.. На каго бог, на таго й людзі! Як толькі былы рагазінскі галетнік стаў вядомым журналістам і пісьменнікам, кулацкія хаўруснікі пачалі пісаць пра яго розныя паклёпы і даносы. Ім, бачыце, не спадабалася праўда, за якую змагаўся Макар Шыянок! А ў часы культу, як вядома, падмётныя творы лічыліся некаторымі асобамі ледзь не самым лепшым жанрам. З любым марыльчыным сэрцу чалавекам стараліся расправіцца нібы з тым ворагам народа. Макару Шыянку давялося прайсці вунь праз якія цяжкія выпрабаванні, вунь колькі пабачыць добрых і благіх людзей! Быў ён і на фронце, і ў партызанах, ваюючы з аўтаматам у руках супроць гітлераўцаў і паліцаяў. І ўсюды яго падтрымлівала і натхняла ціхае і адданае Марыльчына каханне. Марылька вунь як цярпліва, вунь як самаахвярна чакала шчаслівага вяртання свайго любага, свайго адзінага... Чакала, як тая верная незамужняя ўдава... І калі скончылася вайна, яна нават ніводным словам не папракнула Макара яшчэ за адно яго жаніхоўства ў партызанскім атрадзе...

А тут, хай твой двор, не вытрымала, калі Макар сказаў, што яму трэба паехаць: па творчай камандзіроўцы ў Каралін, недзе пад самую Гродню.

— Чаго ты там, у тым Караліне, не бачыў? — чамусьці насцярожліва запыталася Марылька.

— Там, кажуць, таксама ёсць шмат добрых людзей. Мне вельмі хочацца сустрэцца з былым камандзірам партызанскага атрада Міхасём Ларывончыкам. Пра каралінцаў вунь як у газетах пішуць.

На Марыльку нібы варам лінулі. І яна закрычала не сваім голасам:

— Нікуды ты не паедзеш! А калі паедзеш, дык можаш не вяртацца!.. Алімпа Галезнікава там цябе цікавіць, а ніякі не Міхась Ларывончык. І невядома яшчэ ад каго ў гэтай Алімпы Максімка. Бо нешта ён гаворыць да сваёй маці ні па-рагазінску, ні па-разанску: «мам»... Што гэта за «мам»? Адкуль у твайго Максімкі такі блатняцкі жаргон?..

— Гэты вісус такі мой, як і твой, — ужо не стрымаўся і Макар Шыянок. — Чаўпе абы што!

Хай твой двор!.. Разлаваная жанчына падобна на вадародную бомбу, якая можа спаліць увесь свет. Чаго толькі не нагаварыла цяпер Марылька! Макар Шыянок вунь як спалохаўся яе гневу і сказаў паспешліва:

— Нікуды я ад цябе, мая ты ціхая зорка, не паеду. А каб ты мне верыла па-ранейшаму, сёння ж вярну сваю творчую камандзіроўку ў кантору...

Марылька адразу ласкава і неяк вінавата ўсміхнулася Макару. Вунь як яна вылюдзела!

Пятро СУШКО

ПАЛОХАНКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

АСЦЯРОЖНА, ДРАПЕЖНІКІ!

. . . -га,
ды го-го-го!
Даганю яго!

Артур ВОЛЬСКІ

Бусел ловіць жаб.
Рыбу крыўдзіць краб.
Кошка кіпцюрамі
Мышку—
цап-царап!
Ах ты, небарака:
Будзе і табе,—
Загрызе сабака!
Качар задзяўбе!

ЛЯСНЫЯ ЖАХІ

Дук — дак,
Дук — дак!

Рыгор БАРАДУЛІН

Ш — шу,
Шух — шум!
Шум — шух!
Чу — шу!
Шпак — шпок,
Шпок — шпак!
Грак — грук,
Грук — грак!
Крум — крум!
Чак — чак!
Дак — дук,
Дук — дак!
Бух — бах!
Жых — жах,
Жах — жых!
Дры — жы!!!

Літаратура і Мастацтва 2
Аўторак, 1 сакавіка 1966 года

Архітэктурная старонка

МАГІЛЁЎ

Работнікі Магілёўскага аблпраекта—галоўныя архітэктары праектаў І. Магазінер, І. Фралоў, дырэктар аблпраекта заслужаны будаўнік БССР І. Гапеенка, галоўны архітэктар праектаў І. Голубева і галоўны інжынер праектаў К. Мельнік абмяркоўваюць праекты новых дамоў, якія хутка ўзнімуцца ў старажытным горадзе. Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

ГОРАД НЯВЫКАРЫСТАНЫХ МАГЧЫМАСЦЕЙ

Відаць, кожны, хто ўпершыню трапляе ў Магілёў, падпадае пад уплыў самых супярэчлівых уражанняў.

З высокага дняпроўскага берагу, дзе калісьці, яшчэ ў пачатку XIII стагоддзя, быў закладзены горад і гістарычна склаўся яго сённяшні адміністрацыйны цэнтр, адкрываецца шырокая панарама на пойму Дняпра, пясчаныя пляжы, лесапаркі і прамысловыя раёны левабярэжжа.

Выразны рэльеф, адмысловыя перапады, прыгожыя відавыя перспектывы... Якія багатыя магчымасці для самых разнастайных і арыгінальных кампазіцыйных вырашэнняў дае тут архітэктарам прырода! Чаму ж такім безаблічным здаецца гэты старажытны горад, калі бліжэй знаёмішся з ім? Яму ж амаль сем стагоддзяў!

Вядома—нашэсці, войны, разбурэнні... Але справа не толькі ў гэтым. Спусціцеся да берагу Дняпра. Сіратліва на ўзгорку ўзвышаецца яшчэ велічны, нягледзячы на разбурэнні, помнік архітэктуры—Нікольская царква, пабудаваная ў 1625 годзе. Колькі яна прастаіць так, узняўшы пад неба аголеныя кроквы?.. І ці не чакае яе сумны лёс некалі славутага ў Магілёве Кафедральнага сабора, пабудаванага ў XVIII стагоддзі выдатным рускім дойлідам Львовым? Яго знеслі перад вайной, як знеслі пасля вайны Магілёўскую ратушу з велічнай васьмігранной вежай, хаця на гэтым месцы так нічога і не пабудавалі. Між іншым, памянёныя помнікі ахоўваліся законам. Але гэта тэма асобнай размовы. Зараз жа гаворка ідзе пра чыста архітэктурны бок справы. Трэба, нарэшце, зразумець, што старажытная архітэктура, калі яна тактоўна ўключаецца ў сучасныя ансамблі, надае гораду адметны каларыт, узбагачае і робіць больш выразным яго сілуэт, ужо не гаворачы пра тое, што яна сведчыць пра яго становішча ў мінулым, з'яўляецца адзнакай яго ўзросту.

Калі ідзеш па Магілёву, добра бачыш руку тых самаўпраўцаў ад архітэктуры, якія доўгія гады быццам спецыяльна імкнуліся нівеліраваць горад, пазбавіць яго самабытнасці. Датычыцца гэта і больш позніх забудоў. Напрыклад, такі цікавы і своеасаблівы твор архітэктуры, як лангбардаўскі Дом Саветаў—адзін з нямногіх помнікаў станаўлення савецкага архітэктурнага стылю з яго чыстымі, лаканічнымі і велічнымі формамі—аказаўся пасля вайны акружаны аляпаватымі будынкамі ў стылі ілжэкласікі. Дом гэты павінен быў стаць цэнтрам велічнага ансамбля Ленінскай плошчы. Але з цікавымі задумамі першага генеральнага плана, прынятага яшчэ ў 1937 годзе, не палічыліся, перакроілі іх на свой лад.

Цяжка зараз гаварыць, як выглядаў бы Магілёў, калі б вайна не перашкодзіла ажыццявіць гэты план. Аднак тое, што было зроблена ў перыяд пасляваеннага будаўніцтва, несла на сабе адбітак эклектыкі, звязанай з механічным адраджэннем псеўдакласічнай геральдыкі мінулых стагоддзяў.

Згодна з новым генеральным планам аднаўлення і развіцця, распрацаваным у 1946—1949 гадах, у Магілёве пачалі развівацца новыя галіны прамысловасці — металургічная, машынабудаўнічая, электратэхнічная, хімічная, лёгкая, харчовая і інш. План прадугледжваў пашырэнне адміністрацыйнага і жыллёвага будаўніцтва і значны рост насельніцтва горада.

Сёння амаль усе паказчыкі гэтага плана перавыкананы. Што ж датычыць яго непасрэднага архітэктурнага вырашэння, дык яно, мякка кажучы, пакідае жадаць лепшага. Горад распаўся на асобныя, слаба звязаныя між сабой і дрэнна ўпарадкаваныя раёны, забудаваныя ў значнай меры аднапавярховымі індывідуальнымі хацінамі. Больш ці менш закончаным выглядае цэнтр. Аднак дарагое аздабленне яго, якое патрабавала шмат сродкаў, перашкаджала комплекснаму вырашэнню астатніх горадабудаўнічых задач. Горад напускаў важнасць на фасады і пакідаў голымі задворкі.

Пазней ад празмернасцей адмовіліся, але ранейшыя прынцыпы жорсткай паквартальнай забудовы засталіся, і гэта прывяло да таго, што побач з казённа-«прыгожымі» дамамі з'явіліся проста казённа-сумныя дамы. Не ўпрыгожылі горад і новыя мікрараёны і заводскія пасёлкі. Стандартнае індустрыяльнае будаўніцтва пры гэткіх жа стандартных планіровачных і кампазіцыйных вырашэннях, пры стандартнай павярхоўнасці і стандартнай нядобраўпарадкаванасці зрабілі Магілёў падобным на дзесяткі іншых гарадоў. Так і заставаўся ён да апошняга часу горадам нявыкарыстаных магчымасцей.

Да апошняга... Бо сёння гэтыя магчымасці магілёўскія архітэктары і іх куратары з «Белдзяржпраекта» і Дзяржбуда БССР асэнсоўваюць прынцыпова па-новаму. Карэнныя змены, якія ўносяцца цяпер у план развіцця Магілёва на бліжэйшыя дваццаць гадоў, абумовяць па сутнасці новы этап у лёсе старажытнага горада.

ВАЖНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Якія ж фактары вызначаюць далейшае архітэктурнае развіццё Магілёва?..

ПЕРШЫ ФАКТАР. Архітэктары яго называюць горадаўтваральным. Гаворка ідзе пра будаўніцтва ў паўднёвай і ўсходняй частках горада буйных прамысловых раёнаў. Перспектывы, якія адкрываюцца ў сувязі з гэтымі будоўлямі, сапраўды велізарныя. Радавы абласны горад праз некалькі гадоў ператворыцца ў важны цэнтр вялікай хіміі. Не толькі павялічыцца яго народна-гаспадарчае значэнне і пашырацца эканамічныя сувязі з іншымі прамысловымі цэнтрамі. Магілёў зменіць свае маштабы, сваё аблічча,—жыццё яго напоўніцца новым зместам, новымі рытмамі.

Камертонам, які вызначае гучанне абноўленага ў сувязі з прамысловым будаўніцтвам генплана, з'яўляюцца дзелавыя выкладкі эканамістаў. Галоўны інжынер праектаў Леанід Антонавіч Каўчынскі і інжынер-эканаміст майстэрні гарадской і раённай планіроўкі «Белдзяржпраекта» Рыма Сямёнаўна Обласава разгортваюць папкі з разлікамі.

Народнай гаспадарцы краіны патрэбны новыя прамысловыя магутнасці. Але размяшчэнне іх павінна адпавядаць і мясцовым сацыяльна-эканамічным запатрабаваннях. У Магілёве, напрыклад, крывая росту насельніцтва пачынае ўжо апярэджваць патрэбы ў рабочай сіле. Акрамя гэтага, тут ёсць значныя рэзервовыя тэрыторыі, якія трэба асвойваць, каб упарадкаваць гарадскую забудову. Горад адчувае патрэбу ў дарагіх інжынерных збудаваннях. Для гэтага запатрабуюцца вялікія капітальныя затраты. Толькі магутная будоўля можа разам са свайімі ўласнымі задачамі вырашыць і задачы агульнагарадскія.

Але гэта яшчэ не ўсё. Развіццё прамысловасці абумовіць пашырэнне энергабазы, будаўнічай індустрыі, аўтагаспадарак, складскіх памяшканняў, транспартных магістралей, інжынерных збудаванняў. Усё гэта выкліча прыток у горад дадатковай рабочай сілы. Разлікі паказваюць: калі сёння колькасць жыхароў Магілёва ў параўнанні з 1940 годам павялічылася ў паўтара раза, то ў не вельмі далёкім будучым сённяшняе насельніцтва павялічыцца яшчэ ў некалькі разоў. Факт гэты гаворыць пра многае.

ДРУГІ ФАКТАР. Ён датычыць не толькі горада, пра які ідзе гаворка, але ўсёй нашай перыферыйнай архітэктуры, і абумоўлены тымі важнымі зменамі, што адбыліся за апошні час у архітэктурным жыцці краіны. Стала, нарэшце, ясна не толькі архітэктарам, што празмерная цэнтралізацыя стрымлівае развіццё сучаснай савецкай архітэктуры. Сапраўды, на творчыя задумы накладваюцца дзесяткі жорсткіх вета. Будаваць можна... Можна... толькі па агульнадзяржаўных тыпавых праектах. Можна... не вышэй чатырох—пяці паверхаў.

А ці можна наогул пры такіх умовах будаваць добра і разнастайна, зыходзячы з мясцовых умоў, інтарэсаў і патрабаванняў?! Гарады ператвараюцца ў блізняты. Стандартныя праекты, стандартныя мікрараёны, дамы, кватэры, школы, яслі, магазіны, нават кіёскі, аж да стандартных зялёных насаджэнняў і стандартных скульптурных помнікаў...

Рашэнні партыі і ўрада, накіраваныя на развязванне ініцыятывы на месцах, закранулі і архітэктуру. Апошні з'езд архітэктараў асудзіў гэты ўсеагульны стандарт задум, патрэб, «творчых» пошукаў. Перыферыйным праектным арганізацыям сёння дадзена большая самастойнасць. Ім, хоць і з агаворкамі, дазволілі займацца індывідуальным праектаваннем. Як гэта адбілася на дзейнасці магілёўскіх архітэктараў?

Дырэктар Магілёўскага аблпраекта Ілья Цімафеевіч Гапеенка, знаёмячы мяне з новымі праектамі, прапануе прайсціся ў думках па вуліцах горада. Да цэнтра яго — плошчы Леніна—вас падводзіць парадны ўезд з боку Мінскай шашы. Уздоўж шашы, насупраць мікрараёна «Магілёў-2», раскінецца спартыўны комплекс са стадыёнам і Палацам спорту. Над ракою Дубровенкай ужо будуецца шырокафарматны кінатэатр на 800 месц, побач—Дом піянераў з прасторнай актавай залай, галоўным корпусам і плавальным басейнам. Шматпавярховая гасцініца «Інтурыст», у 250 нумарах якой на першым часе размесцяцца замежныя спецыялісты, што прымуць удзел у будаўніцтве лаўсанавага камбіната, узнімецца насупроць Дома чыгуначнікаў.

Сярод праектаў, створаных магілёўскімі архітэктарамі, мой субяседнік асабліва адзначае складаны праект лабараторнага корпуса машынабудаўнічага інстытута. Гэта цэлы комплекс лабараторый. Ён ужо будуецца. Выкапаны катлаван і для новага Дома палітасветы з актавай залай на 800 месц і лекцыйнай—на 250.

Насупраць яго, на Тэатральнай плошчы, нядаўна закончылася будаўніцтва першага, як яго называюць у Магілёве, «высотнага» жылога дома на дзевяць паверхаў. Другі будынак—на адзінаццаць паверхаў—будзе на рагу вуліц Першамайскай і Міронава.

Пералічаныя аб'екты, якія ў асноўным завершаць забудову цэнтра горада і, мяркуючы па праектах, унясуць новы струмень у яго архітэктурнае аблічча, праектаваліся архітэктарамі Я. Бенядзіктавым, М. Мызнікавым, Е. Лукомскай, Р. Вігдорчыкам, В. Фядосавым, І. Фраловым, А. Кучарэнкам, А. Семяненка і інжынерамі С. Нікалаевым, К. Мельнік, Р. Алексіным, Г. Казакевіч і іншымі. Гэта толькі асобныя рысы велічнага плана будоўлі. Асноўныя ж работы разгорнуцца пры закладцы новых мікрараёнаў. Вопыт мікрараённага будаўніцтва ў Магілёве пакуль што невялікі. Мікрараёны «Магілёў-2» і «Мір» налічваюць усяго некалькі дзесяткаў дамоў. Новы ж генеральны план прадугледжвае толькі ва ўсходняй зоне пабудаваць жылы масіў на 35 тысяч жыхароў з усім комплексам абслугоўвання! Гэта цэлы горад! Побач з ужо асвоенымі буйнапанельнымі пяціпавярховымі дамамі тут мяркуюць узвесці індустрыяльным метадам таксама і дзевяці—адзінаццаціпавярховыя гмахі.

Клубы, паліклінікі, кінатэатры, школы, дзіцячыя сады і яслі, магазіны, спартыўныя пляцоўкі, стадыён, установы бытавога абслугоўвання—вось далёка няпоўны пералік аб'ектаў, якія разам са ста жылымі дамамі складуць новы комплекс.

Па сутнасці новы горад замест раней запланаваных трох мікрараёнаў вырасце і ў Задняпроўскім раёне, дзе размяшчаецца сённяшняе Лупалава. З цэнтрам яго аб'яднаюць шырокая зялёная зона адпачынку ўздоўж Дняпра і набярэжная.

Планы гэтыя выклікаюць у магілёўскіх архітэктараў і будаўнікоў творчы ўздым, але разам з тым і з'яўляюцца прычынаю сур'ёзнай заклапочанасці.



Праект шматпавярховага 60-кватэрнага жылога дома, які будзе пабудаваны на рагу вуліц Першамайскай і Міронава. Аўтар праекта—архітэктар А. Кучарэнка.

КАЛЕЙДАСКОП ПРАБЛЕМ

Аднак, якія б ні былі прывабныя перспектывы развіцця Магілёва, трэба памятаць пра старую жыццёвую мудрасць: збіраешся ў далёкую дарогу—правер, ці ўсё ты прадугледзеў, улічыў, узважыў. Так і архітэктарам Магілёўскага абпраекта, «Белдзяржпраекта» і Дзяржбуда БССР неабходна сёння ўзважыць свае магчымасці і ўлічыць памылкі мінулага—як творчыя, так і арганізацыйныя.

Начальнік абласнога будаўнічага ўпраўлення Ігар Аляксандравіч Гапонаў, з якім мы аб'ездзілі новыя будоўлі, на слове **арганізацыйныя** робіць асаблівы націск. Справа ў тым, што менавіта яны перашкаджаюць дасягнуць неабходнага добраўпарадкавання, камфорту і эстэтыкі новых забудоў.

Як вядома, сама ідэя мікрараяніравання зыходзіць з патрэб забеспячэння максімуму выгод для жыхароў, мэтазгоднай арганізацыі бытавога і культурнага абслугоўвання. На справе нярэдка атрымліваецца наадварот. Але вінавата не ідэя, а метады яе ажыццяўлення. Паглядзіце, што робіцца ў новых магілёўскіх мікрараёнах (ды ці толькі ў магілёўскіх!). Адзін за другім узнімаюцца новыя дамы, навасёлы атрымліваюць ключы ад кватэр. Але радасць іх хутка засмучаецца. Побач ні школы, ні дзіцячага сада, ні ясляў, нават магазінаў першай неабходнасці няма. І даводзіцца па прадукты ісці на край свету ды яшчэ па калена ў гразі, праз горы разварочанай зямлі і будаўнічага смецця, пераадольваючы незасыпаныя траншэі. Навокал ні дрэўца, ні кусціка. Дзяцей выпусціць пагуляць няма куды.

А ў праекце ж усё выглядала інакш—пясочнікі, альтанкі, спартыўныя пляцоўкі, вясёлыя зялёныя лужкі, пешаходныя сцежкі, выкладзеныя плітамі. Усё гэта, як і мікрараённы гандлёвы цэнтр, засталося на паперы.

Чаму ж так адбываецца?

— А таму,—з прыкрасцю адказвае мой субяседнік,—што каштарысныя нормы будаўніцтва мікрараённаў не адлюстроўваюць сапраўдных затрат. Яны механічна бяруцца з практыкі забудовы гарадскога цэнтра, дзе яшчэ сяк-так можна ўкласціся ў законныя 120 рублёў на адзін квадратны метр жылля. У мікрараёне ж за гэтыя сродкі трэба пабудаваць і магазін, і цэлы рад іншых устаноў, не гаворачы ўжо пра складаную падземную гаспадарку. У выніку будаўніцтва каштуе 160 рублёў за той жа метр.

Дзе ж іх узяць? Не пакінуць жа дом без даху! Вось і даводзіцца эканоміць на добраўпарадкаванні, на камфорце, на эстэтыцы, а сродкі, запланаваныя на ўсё гэта, укладваць у асноўнае будаўніцтва.

Сумы на азеляненне, напрыклад, наогул здымаюцца яшчэ пры складанні каштарыса. Лічаць, што гэтую частку будаўніцтва можна ажыццявіць сіламі саміх жыхароў у парадку грамадскай самадзейнасці. У выніку атрымліваецца такая «самадзейнасць», што сорамна глядзець: у кожнага свой палісаднічак, градка са штакетнікам. Вось вам эстэтыка сучаснага горада.

Якое ж выйсце?

Па-першае, трэба складаць рэальныя каштарысы. Па-другое, перагледзець сам метад размеркавання заказаў. Заказчыкам на будаўніцтва жылля ў мікрараёне з'яўляецца ўпраўленне капітальнага будаўніцтва, на што яму і адпускаюцца сродкі. У лепшым выпадку яго можна абавязаць за кошт пяці працэнтаў усё ад тых жа 120 рублёў убудаваць у жылыя будынкі магазіны. Фінансаванне ж астатніх аб'ектаў—школ, ясляў, дзіцячых садоў, камбінатаў бытавога абслугоўвання—вядзецца адпаведнымі ведамствамі і ўстановамі. А трэба зрабіць так, каб фінансавалася будаўніцтва не паасобных дамоў, а адразу ўсяго мікрараённага комплексу і каб на яго быў адзін заказчык. Тады не будзе ляпсуса накшталт таго, што адбыўся ў мікрараёне «Магілёў-2». Замест убудаваных магазінаў тут быў запраектаваны асобны цэнтралізаваны гандлёвы цэнтр. Гэта адпавядае патрабаванням гігіены і выгод пакупнікоў і з'яўляецца больш рацыянальным і эканамічным метадам гандлёвага абслугоўвання. Метад гэты прымяняецца сёння шмат у якіх краінах. Што ж з гэтага атрымалася? Адзін за другім пабудавалі 23 жылыя дамы, а на гандлёвы цэнтр так і не знайшлі заказчыка—гандлёвую арганізацыю, якая б згадзілася фінансаваць яго будаўніцтва. Давялося вярнуцца да зыходных пазіцый—тэрмінова абавязаць Упраўленне капітальнага будаўніцтва абсталяваць у жылых дамах некалькі магазінаў за кошт усё тых жа працэнтаў.

Другая арганізацыйная бяда — Магілёўскі домабудаўнічы камбінат выпускае толькі адну серыю дома — 335, самую няўдалую з усіх буйнапанельных варыянтаў, якія існуюць. Некалі яе запазычылі ў Ленінградзе. Але ленінградцы самі ад яе адмовіліся. Яна недасканалая ў канструктыўных адносінах. Пра эстэтыку ж яе і гаварыць не даводзіцца.

Сёлета завод мяркуе асвоіць новую серыю — 335-а, з палепшанай планіроўкай і больш выразным фасадам. Аднак адной, хай і палепшанай, серыі на такі горад яўна мала. І каб не забудоўваць усю тэрыторыю аднатыпавымі дамамі, даводзіцца рэзерваваць участкі да лепшых часоў. Гэта падаражае будаўніцтва. Трэба ўжо сёння пачаць праектаваць хаця б эксперыментальныя дамы для гэтых участкаў!

У гэтай сувязі паўстае і другое пытанне. У аблпраекце каля 200 спецыялістаў, але сярод іх толькі пяць архітэктараў з вышэйшай адукацыяй. І яны проста фізічна не могуць вырашыць усе праблемы. Трэба ж вырашаць яшчэ і задачы малой архітэктуры, афармляць вітрыны, праектаваць рэкламу, інтэр'еры.

На жаль, усімі гэтымі важнымі пытаннямі сёння займаюцца ад выпадку да выпадку і ў асноўным у парадку самадзейнасці. Час, нарэшце, дамагчыся, каб кожны абласны праектны інстытут меў сваю спецыялізаваную майстэрню архітэктуры малых форм і інтэр'ераў. Работы гэтыя трэба даручаць прафесіяналам. І словы іх павінны быць законам як для выканаўцы, так і для заказчыка. На жаль, пакуль што архітэктар і мастак не маюць ніякіх юрыдычных правоў. Любы дырэктар магазіна або рэстарана, любы прараб на будоўлі можа ў лепшым выпадку ветліва выслухаць іх, але зрабіць па-свойму. Як ні сумна, а заканадаўцам густу пакуль што застаецца той, хто плаціць.

Пералік падобных праблем можна падоўжыць. Але справа не ў іх колькасці. Пры ўсёй сваёй уяўнай рознатыповасці яны сведчаць аб адным—аб нізкай культуры арганізацыі горадабудаўніцтва, аб негаспадарчым, неэканамічным, ненавуковым падыходзе да яго. Вось таму сёння, калі ў Магілёве разгортваецца сапраўды вялікае будаўніцтва, з гэтым ніяк нельга мірыцца.

...І ТРАНСПАРТ

Як праехаць у Магілёве з аднаго канца горада ў другі?.. Нават старажыл, перш чым адказаць на пытанне, яшчэ і яшчэ раз перабярэ ў памяці нумары аўтобусаў і перасадкі, якія вам давядзецца зрабіць.

Па колькасці аўтобусных маршрутаў Магілёў займае першае месца сярод абласных гарадоў рэспублікі. Тут 23 унутрыгарадскіх і сорак прыгарадных аўтобусных ліній, тады як у Гомелі, напрыклад, дзе насельніцтва куды больш, іх усяго чатырнаццаць. У чым жа прычына?

Складаны рэльеф, рэкі, вялізныя яры з адгор'ямі, разгалінаваны чыгуначны вузел—вось тыя натуральныя і штучныя перашкоды, якія скоўваюць сёння нармальнае развіццё гарадскога транспарту. У выніку Магілёў аказаўся разбітым на асобныя ўчасткі са сваімі транспартнымі маршрутамі. Для пасажыраў гэта выклікае шматлікія перасадкі, чэргі на прыпынках, дадатковую трату часу і сродкаў на пераезды, а для работнікаў транспарту — ускладненнем усёй службы руху і абслугоўвання.

Надышоў час кардынальна вырашыць гэтыя праблемы, пабудаваць масты, шляхаправоды, пераезды, транспартныя развязкі і новыя магістралі, каб звязаць горад у адзіны арганізм. Над гэтай праблемай і працуе сёння аддзел гарадскога транспарту «Белдзяржпраекта».

Пачыналі мы, расказваюць архітэктары-транспартнікі В. Фёдараў і А. Носаў-Бяляеў, з вывучэння патрэб насельніцтва. Падключылі да гэтай справы і магілёўскіх транспартнікаў, арганізавалі праз мясцовае радыё і друк анкетнае апытанне. Трэба было высветліць, якія з ужо складзеных маршрутаў найбольш загружаны, у якіх напрамках часцей ездзяць магіляўчане, дзе жывуць, дзе працуюць. А потым у атрыманыя звесткі ўнесці карэктывы, абумоўленыя перспектывамі далейшага развіцця горада. Пры гэтым трэба ўлічыць і прыродныя ўмовы, выбраць найбольш зручныя ўчасткі для будаўніцтва мастоў і шляхаправодаў праз яры, рэкі і чыгунку. Пракладка асноўных транспартных магістралей павінна звязаць найбольш важныя жыллёвыя і прамысловыя раёны, ахапіць цэнтральныя магазіны, кафэ, рэстараны, кінатэатры, адміністрацыйныя ўстановы, інстытуты і разам з тым не перагрузіць вуліцы транспартам. Бо кожнае перагружанае скрыжаванне—гэта трата часу ля чырвоных семафораў, перапальванне бензіну, дадатковыя прычыны аварый.

Распрацоўка генеральнага плана развіцця магілёўскага гарадскога транспарту падыходзіць да завяршэння. Згодна з ім пачнецца будаўніцтва новага моста цераз раку Дзебру, які звяжа цэнтр горада з усходняй зонай. З заканчэннем будаўніцтва моста цераз Дубровенку будуць звязаны з цэнтрам і мікрараёны «Магілёў-2» і «Мір». Новы шырокі мост звяжа берагі Дняпра. Над чыгуначнымі магістралямі замест шлагбаумаў узнімуцца шырокія прыгожыя шляхаправоды.

Калі інжынеры-транспартнікі разлічаць асноўныя пасажырскія патокі, пачнецца пракладка тралейбуснай лініі. Тралейбус возьме на сябе да 30 працэнтаў пасажырскіх перавозак. Усё гэта, нягледзячы на значнае павелічэнне адлегласцей, колькасці пасажыраў, грузаў, значна спросціць і зробіць больш выгоднай агульную транспартную сетку горада.

Так генплан вырашае яшчэ адну са складаных горадабудаўнічых задач.

□

Мы пазнаёміліся коратка з горадабудаўнічымі праблемамі яшчэ аднаго з абласных цэнтраў рэспублікі. І наша размова пра развіццё сучаснай перыферыйнай архітэктуры, якую вядзе газета, кранулася яшчэ адной тэмы. Горад і прамысловасць — так яе можна сфармуляваць.

Прамысловасць амаль заўсёды з'яўлялася асноўным стымулюючым фактарам развіцця гарадоў. Аднак і ў гэтай заканамернасці сёння выяўляецца тое новае, што стала характэрным для сучаснай савецкай архітэктуры.

Прывязка таго ці іншага прамысловага аб'екта не ператвараецца ў нас у самамэту, не мае на мэце вузкаведамасныя інтарэсы. Яны звязваюцца з інтарэсамі развіцця горада ў цэлым, з задавальненнем разнастайных патрэб яго жыхароў. Гэта немінуча адбіваецца на фарміраванні гарадской архітэктуры.

Размах жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва, комплекснае вырашэнне складаных горадабудаўнічых праблем у сувязі з развіццём у Магілёве новых вытворчых магутнасцей — яркі таму прыклад.

У выніку шырокіх мерапрыемстваў горад набывае структурную і кампазіцыйна-планіровачную завершанасць, сучаснае архітэктурнае аблічча.

«Архітэктурная старонка» падрыхтавана спецыяльным карэспандэнтам «Літаратуры і мастацтва» Алегам СУРСКІМ.



Новы жылы дом на Тэатральнай плошчы.

Малюнак І. ФРАЛОВА.



МАГІЛЁЎ. Цэнтральная плошча горада—плошча імя Ул. І. Леніна.

Фота А. БОРЧЫКА.

КРОПЛЯ ПАТОКУ

Б. ЗВІНАГРОДСКОМУ — 70 ГАДОЎ

Творчасць кожнага мастака ўліваецца кропляю ў ручайкі, якія, зліваючыся разам, ствараюць магутнае рэчышча нястрымнага патоку мастацтва. Кожны мастак прыносіць сваё, непаўторнае ў пазнанне найглыбейшага свету душы чалавечай.

Сваё, непаўторнае здолеў прынесці ў мастацтва і Барыс Фёдаравіч Звінагродскі.

Ён назаўсёды звязаў сваё жыццё і творчасць з Гомельшчынай.

Кожны з яго вучняў можа пасведчыць: самае першае, што прышчапляе ён шматлікім сваім вучням,—гэта сумленнасць падыходу да мастацтва. Бо сам ён крыштальна чысты ў служэнні яму. Яго творы пазбаўлены параднасці. Усё жыццё ён марыць напісаць бярозку так, каб яна была сучаснай у пейзажы, у якім няма штампаваных прыкмет часу, накшталт славутых «тэлеграфных слупоў».

Доўгі час для яго была характэрная пільная ўвага да дэталяў, да дробязей пейзажа. Гэта — вынік жадання зразумець, вывучыць кожную дэталь, каб пасля перайсці да абагуленага бачання прыроды. Але вось сёння — ў апошнія паўтара-два гады — характар яго мастацкага мыслення істотна змяніўся. Да мастака прыйшлі майстэрства пластычна-абагуленага пісьма, надзвычайная прастата кампазіцыі і каларыстычных гам.

Звінагродскі ніколі не разлічваў на хуткі поспех сваіх палотнаў. Гэта датычыць усіх яго лепшых работ.

Ён любіць сцвярджаць: «Імгненнасць пісьма — гэта не манументальнасць. Прымітыўнасць — гэта не лаканізм. А лёгкаважкасць мыслення і ўсёдараванне сабе—далёка не вышэйшая мудрасць у мастацтве». Іменна таму ён не кідаецца ў крайнасці, шукаючы наватарскі стыль. Ён захоўвае вернасць агульным прынцыпам перадзвіжнікаў, на іх аснове ведучы свой пошук новага, вынік якога кропляю ўліваецца ў магутны паток сучаснага мастацтва.

Яго шматлікія пейзажы Гомельшчыны, яго нацюрморты поўныя замілавання да роднай зямлі, да чалавека працы, да яго ўнутранага свету, які раскрываецца перад намі, калі мы глядзім палотны мастака.

Яго ўлюбёны афарызм — «манера гэта не самамэта, а вынік». Таму і знаходзіць ён у сваёй душы месца побач з любоўю да перадзвіжнікаў і для Канстанціна Каровіна. — Трэба пачынаць не з манеры, не са стылю, а канчаць імі, — сцвярджае Звінагродскі.

Асноўная маса даваенных работ Звінагродскага, на вялікі жаль, загінула. Але на сённяшні дзень ён ізноў стварыў непаўторныя, арыгінальныя палотны, якія захоўваюцца ў музеях рэспублікі, у майстэрні мастака.

Звінагродскі — пейзажыст. Здаецца, ён не напісаў ніводнага партрэта. Але кожны з яго пейзажаў — частачка вялікага аўтапартрэта мастака, які адчувае сябе часцінкаю сваёй вялікай сацыялістычнай Айчыны. Ён умее любавацца прыгажосцю свету, усім светам цалкам і кожнай травінкай у паасобку.

Адчуваннем свабоды, прасторы поўныя яго работы апошняга часу. Напрыклад, такія, як «Вясна на ўскраіне Гомеля» і «Мірнае неба». Адчуванне гаспадара гэтых прастораў, сыноўняя любоў да іх жывуць у пейзажах майстра.

Знаёмячыся з яго палотнамі, адчуваеш любоў мастака да ветру, сонца, воблакаў, мудрую пяшчоту чалавека, які расцірае жменьку зямлі ў далоні... Адкрываецца сэрцу пластычнасць самых простых матываў прыроды, кволая дымка толькі што выбухнуўшых на бярозе лісточкаў. Такія простыя, такія будзённыя рэчы... Але гаворка вядзецца пра іх сапраўды паэтычна. І — што вельмі важна — з вострым пачуццём сучаснасці. Сучаснасці не ў знешніх аксесуарах палотнаў, а ў самой іх сутнасці, у сучаснасці мыслення і пачуццяў самога мастака.

Б. Звінагродскі па сутнасці сваёй народны мастак. Ён занатаваў у сваіх творах істотныя рысы сённяшняй Савецкай Беларусі, яе прыроду, яе адлюстраванне ў душы савецкага чалавека-працаўніка.

Сціпласць гэтага чалавека і мастака — здзіўляючая. Трэба бачыць, з якім жаданнем выслухаць, памагчы гаворыць ён са сваімі вучнямі — таленавітымі і пазбаўленымі таленту. Ён паважае ў іх прагу да творчасці. Мабыць, таму і ўдаецца яму пераканаць іх у тым, што мастак павінен патрабавальна ставіцца да сябе. Бо сам ён дае такі прыклад.

Сёння, хоць ён ужо не вядзе заняткаў у студыі, да яго ўсёадно цягнецца моладзь. Ён марыць аб стварэнні ў Гомелі абласной мастацкай дзіцячай школы. Мастак поўны новых задум — творчых і арганізацыйных. У гэтым — сутнасць яго натуры мастака-грамадзяніна, які яшчэ шмат цікавага створыць у нашым мастацтве.

А. ДАБРАВОЛЬСКІ,
аспірант Інстытута філасофіі і права АН БССР.

Сакавіцкі КІНАЭКРАН

Новая двухсерыйная карціна Міхаіла Рома «Звычайны фашызм» удастоена спецыяльнай вышэйшай прэміі на Міжнародным кінафестывалі ў Лейпцыгу літаральна адразу ж пасля першага афіцыйнага прагляду. У гэтай карціне, створанай на студыі «Масфільм» па сцэнарыі М. Рома, М. Туроўскай і Ю. Ханюціна шырока выкарыстаны трафейныя хранікальныя матэрыялы з кінаархіваў міністэрства прапаганды фашысцкай Германіі, асабістага фотаархіву Гітлера, шматлікія фотаздымкі, знойдзеныя ў эсэсаўцаў, а таксама дакументальныя кінаматэрыялы Польшчы, ГДР, Савецкага Саюза.

Фільм бязлітасна выкрывае фашызм, паказвае яго вытокі, вучыць пільнасці, грамадзянскай мужнасці.

Дон-кіхотамі часта называюць рассеяных дзівакоў, летуценнікаў, непрактычных, непрыстасаваных да жыцця людзей.

Гэтай мянушкай ахрысцілі і героя новай кінакамедыі «Дзеці Дон-Кіхота», пастаўленай рэжысёрам Яўгенам Карэлавым на кінастудыі «Масфільм» па сцэнарыі Н. Фаміной. Пытанні сумленнасці, справядлівасці, прынцыповасці — вось што хвалюе прыёмных сыноў доктара Бандарэнкі. Перад кожным з іх жыццё ставіць свае задачы, часта складаныя, іншы раз нечаканыя, забаўныя. Але высокія маральныя якасці, выхаваныя ў іх доктарам, дазваляюць кожнаму самастойна знайсці правільны адказ.

Галоўныя ролі выконваюць: доктар—А. Папанаў, Вера Пятроўна—В. Арлова, Віктар—Ул. Каранеў, Дзіма—Л. Прыгуноў, Марына — Н. Фацеева, Валя—Н. Зорына і інш.

Масква. Раніца. Плошча Дзяржынскага. Усюды людзі, людзі, людзі... Яны спяшаюцца. Звычайны дзень звычайнага тыдня. Але ўважлівы назіральнік знойдзе ў гэтым дні нешта незвычайнае. Ён убачыць аўтобусы з надпісамі «Масфільм», грузавікі з апаратурай. Убачыць, як дзелавіта, без шуму разыходзяцца ў розныя бакі людзі, ля газетнага кіёска ствараецца чарга. Але цяжка заўважыць, што ўсё гэта ўжо здымаюць кінакамеры—так праходзілі здымкі некаторых эпізодаў карціны «Лебедзеў супраць Лебедзева». Здымкі не зусім звычайныя. У групе іх называюць хранікальна-рэпартажнымі, або здымкамі са схаванай камерай. А гэта значыць, што мноства людзей, якіх зафіксіруе кінааб'ектыў, нават не падазраюць, што апаратар іх здымае.

І вось цяпер фільм «Лебедзеў супраць Лебедзева» выходзіць на экраны рэспублікі.

— У гэтай кінакамедыі, —гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык Генрых Габай,— няма прывычных схем чалавечага лёсу, і невядома, што прынясе наступны крок героя—ці то смех, ці то смутак. Мы не імкнуліся забяспечыць Лебедзева этыкеткамі «станоўчы» або «адмоўны». Гэта жывы чалавек, які пакутліва шукае выйсце з таго становішча, у якое трапіў, і ў канчатковым выніку перамагае ўласную слабасць.

Лебедзеў — гэта кожны з нас. Праўда, у фільме некаторыя сітуацыі наўмысна завостраны, гіпербалізаваны.

У ролі Лебедзева здымаўся артыст Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра імя М. Горкага Уладзімір Рацэптар. Сцэнарый фільма напісаны Феліксам Міронерам.

Імя маладога кінарэжысёра Аляксандра Міты добра вядома нам па карцінах «Без страху і дакору» і «Сябра мой, Колька!». У сакавіку на суд гледачоў перадаецца новая работа рэжысёра—мастацкая кінастужка «Звоняць, адчыніце дзверы!», створаная ім на кінастудыі «Масфільм» па сцэнарыі Аляксандра Валодзіна.

Гэты фільм расказвае пра натуральны працэс пераемнасці пакаленняў, пра ўзаемаўплыў людзей і пра шчырыя, зацікаўленыя адносіны чалавека да жыцця, да сваіх абавязкаў, якія заўсёды робяць яго дзейнасць патрэбнай і значнай.

У галоўных ролях заняты Лена Проклава, Ралан Быкаў, Уладзімір Белакураў, Сяргей Ніканенка, Ія Савінава і інш.

І пятая новая работа масфільмаўцаў, якую гледачы таксама ўбачаць у сакавіку, — «Дарога да мора» пастаўлена рэжысёрам Ірынай Паплаўскай па матывах аповесці І. Лаўрова «Сустрэча з цудам». У ёй гаворка ідзе пра забаўныя прыгоды дзяўчат-блізнят Асі і Слаўкі, якія вырашылі ў што б там ні стала паступіць у мараходнае вучылішча.

З вялікай цікавасцю глядзіцца новая двухсерыйная шырокаэкранная мастацкая кінааповесць «Іду на навальніцу», створаная рэжысёрам Сяргеем Мікаэлянам на кінастудыі «Ленфільм» па аднайменнаму раману Данііла Граніна.

У ролі Крылова здымаўся А. Бяляўскі, у ролі Туліна—В. Ланавой. У астатніх ролях заняты Р. Плят, М. Астангаў, Ж. Прахарэнка, В. Ляпко, Е. Лебедзеў, Л. Прыгуноў і інш.

Кадр з фільма «Звоняць, адчыніце дзверы!».

У сакавіку на экраны рэспублікі выпускаюцца таксама новыя мастацкія кінафільмы «Апошні месяц восені» («Малдовафільм»), «Цары» (Адэская кінастудыя), «Жыццё прайшло ноччу» («Узбекфільм») і «Каго мы больш любім» («Азербайджанфільм»).

З зарубежных кінастужак гледачы змогуць прагледзець балгарскую — «Выкрадальнікі персікаў», румынскую — «У чатырох кроках ад бясконцасці», польскую — «Заказаны пінгвін», чэхаславацкую — «Замах», бразільскую — «Абрабаванне паштовага цягніка», японскую — «Горды выклік», фільм вытворчасці кінастудыі «Дэфа» (ГДР) — «Мінута маўчання» і інш.

З нашай ПОШТЫ

ПРА ЧЫТАЦКІ ПОПЫТ І ГАНДЛЁВЫ КЛОПАТ

Мы, студэнты-філолагі, з задавальненнем прачыталі артыкул А. Мальдзіса «Зачараванае кола», змешчаны ў «Літаратуры і мастацтве» ад 22 лютага. Пытанні, якія хвалююць аўтара, з'яўляюцца набалелымі і для нас. Сапраўды, чаму ў нашых кніжных магазінах часам нельга купіць патрэбную кнігу? Чаму, адразу ж па выхадзе той ці іншай цікавай кнігі, яе немагчыма знайсці ні ў адным магазіне горада?

Асабліва цяжка набыць паэтычныя зборнікі. Мы, напрыклад, так і не купілі зборнікі П. Макаля «Круглы стол», Д. Бічэль-Загнетавай «Нёман ідзе», М. Танка «Глыток вады», Е. Лось «Харраство», «Дзень паэзіі».

Нам, будучым педагогам, давядзецца працаваць у вёсцы. Бібліятэкі сельскіх школ, як вядома, не надта багатыя літаратурай. Вопыт студэнтаў-пяцікурснікаў, якія зараз праходзяць практыку ў вёсцы, сведчыць, што вельмі цяжка выкладаць літаратуру, не маючы ўсіх неабходных тэкстаў. Таму мы загадзя складаем свае ўласныя бібліятэчкі, і хацелася б рэгулярна папаўняць іх новымі выданнямі. Нам вядома вельмі сумная, амаль што анекдатычная гісторыя, калі адна настаўніца верш П. Броўкі «Пахне чабор» вывучала з вучнямі на рускай мове, бо не змагла нідзе знайсці яго на беларускай.

Вельмі патрэбны нам і метадычныя дапаможнікі па літаратуры. Але выпускаюцца яны такімі маленькімі тыражамі, што набыць іх удаецца вельмі рэдка. Напрыклад, кніга-альбом «Янка Купала. Жыццё і творчасць. Матэрыялы выстаўкі ў школе» дайшла да Брэста ў колькасці 70 экземпляраў. А колькі ў нас настаўнікаў і студэнтаў?

Вялікая прэтэнзія ў нас і да рэспубліканскага магазіна «Кніга—поштай». Некаторыя нашы студэнты яшчэ ў мінулым годзе звярталіся туды з просьбай выслаць кнігу В. Бандарчыка «Еўдакім Раманавіч Раманаў», заказвалі мы другія кнігі беларускіх пісьменнікаў, але да гэтага часу ніхто з нас не атрымаў ні кніг, ні адказу. А звернешся з просьбай у Кіеў—ці кнігі, ці адказ атрымаеш амаль што на працягу тыдня. Робіцца і балюча і крыўдна за тое, як вядзецца прапаганда кніг у нашай рэспубліцы.

Мы поўнасцю падзяляем думкі, выказаныя аўтарам артыкула. Даўно ўжо час па-дзелавому вырашыць гэтае вельмі важнае пытанне. Хацелася б, каб творы нашых любімых пісьменнікаў перасталі быць бібліяграфічнай рэдкасцю, а прыйшлі да кожнага, хто любіць родную літаратуру.

Па даручэнню членаў гуртка беларускай літаратуры
Н. СТЭЛЬМАХ, С. СТАНІСЛАВІЧ,
студэнты Брэсцкага педінстытута.

□

Артыкул А. Мальдзіса «Зачараванае кола»—знайшоў гарачы водгук і падтрымку ў многіх чытачоў «Літаратуры і мастацтва», у шматлікіх кнігалюбаў.

Мне таксама колькі разоў (і не ў адным магазіне) даводзілася чуць адказы прадаўцоў, што трылогіі Я. Коласа «На ростанях» няма. І раптам цуд: на прылаўках паяўляюцца цэлыя стосы гэтай кнігі... але ўжо ўцэненай. Сёння прадаўцы гавораць, што трылогію раскупілі. Значыцца, кніга патрэбна была людзям, а яе хавалі ад іх. А калі не хавалі, то не надта стараліся паказваць. Тое ж самае было і з кнігамі М. Лынькова, Я. Маўра, А. Куляшова, з творамі А. Чэхава, Л. Талстога ў перакладзе на беларускую мову.

Хочацца сказаць і аб іншых фактах.

Пасля паведамлення ў газетах, што выйшла з друку і паступіла ў магазіны кніга Л. Ф. Тамашовай «Выкладанне літаратуры ў 8 класе», я пабег у Цэнтральны кніжны магазін, каб набыць яе. Але дзе там! «Спазніліся»,—сказалі мне. Доўга не думаючы, я кінуўся ў кнігарню, што каля вакзала, але і там мяне расчаравалі. Тут я ўспомніў, што ёсць яшчэ магазіны ў мікрараёне на Арлоўскай, на Валгаградскай. Розы Люксембург, каля Тэатра імя Янкі Купалы. Але ўсё было дарэмна.

Такі прабег па магазінах паўтарыў я месяцы праз два. На гэты раз шукаў я кнігу «Літаратурныя гульні», выпушчаную выдавецтвам «Народная асвета». І цяпер дзеці просяць мяне дастаць ім «Літаратурныя гульні». Але... Перадаю іх просьбу тым асобам, якія вызначаюць тыражы кніг. А заадно пытаюся: «Чаму я і іншыя засталіся без вельмі патрэбных кніг? З якіх меркаванняў вызначаюць таварышы тыраж той ці іншай кнігі?» Калі з колькасці школ, то іх у Беларусі звыш дзесяці тысяч. А ў кожнай школе не адзін настаўнік. Тыраж жа кнігі Тамашовай усяго 4600, «Літаратурных гульняў»—7600.

А можа гэтыя кнігі ляжаць дзе-небудзь на складах?

Вельмі правільна ставіць пытанне А. Мальдзіс і аб адкрыцці ў Мінску фірменнага кніжнага магазіна. Чаму мы павінны ў пошуках кніг беларускіх выдавецтваў насіцца па ўсяму гораду?

г. Мінск. **Ул. МОРМАЛЬСКІ.**

МАСТАК ВЫКРЫВАЕ

НАТАТКІ ПРА ФІЛЬМ МІХАІЛА РОМА «ЗВЫЧАЙНЫ ФАШЫЗМ»

Здарылася так, што фільм «Звычайны фашызм» з'явіўся перад судом гледачоў задоўга да яго афіцыйнай прэм'еры. У гонар Першага ўстаноўчага з'езда Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР было вырашана паказаць у радзе кінатэатраў Масквы некалькі лепшых, толькі што закончаных фільмаў, копіі якіх будуць гатовы пазней. Сярод ігравых карцін апынуўся адзін дакументальны фільм «Звычайны фашызм».

Сёй-той трывожыўся: а ці «пройдзе» ў кінатэатрах мастацкіх фільмаў дакументальная, да таго ж двухсерыйная стужка? І вось аказалася, што сярод бясспрэчна яркіх, таленавітых фільмаў, паказаных у гонар з'езда кінематаграфістаў, найбольшую цікавасць выклікала гэтая дакументальная карціна. На яе было немагчыма дастаць білеты.

Амаль у гэты ж час на Лейпцыгскім міжнародным кінафестывалі дакументальных і кароткаметражных фільмаў «Звычайны фашызм» атрымаў дзве ўзнагароды — асобную прэмію фестывалю і прэмію крытыкаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

У чым сакрэт такога поспеху дакументальнага фільма, пастаўленага буйнейшым майстрам ігравога кіно, народным артыстам СССР Міхаілам Ромам па сцэнарыі, напісаным ім разам з вядомымі кінакрытыкамі Маяй Туроўскай і Юрыем Ханюціным? У тым, што аўтары хацелі паказаць не гісторыю фашызму, а стварыць свайго роду фільм-роздум, фільм-размову, якая вядзецца з гледачом пры дапамозе кінадакументаў. Як прызнаўся М. Ром, яны разлічвалі на тое, што глядач будзе думаць у час дэманстрацыі карціны і сам дагаворваць тое, што не ўдасца сказаць. А думаць яму давядзецца шмат і пра многае.

Калі на «Масфільме» пачалі работу над «Звычайным фашызмам», на сусветным экране прайшоў ужо не адзін дзесятак антыфашысцкіх стужак. Патрэбна была немалая смеласць, каб заявіць гэтую тэму. Неабходны быў свой новы пункт гледжання, каб рызыкнуць уключыцца ў спаборніцтва. Сваю пазіцыю аўтары стужкі раскрываюць у першых жа радках, калі на экране ўзнікае назва фільма, а мы чуем голас яго пастаноўшчыка М. Рома:

«Паказваючы вам нашу карціну «Звычайны фашызм», мы, зразумела, не разлічвалі асвятліць усе бакі такой з'явы, як фашызм. Гэта немагчыма ў межах адной карціны.

Так, гэта немагчыма хоць бы таму, што многае, вельмі важнае, не пакінула ніякіх слядоў на плёнцы. Не было знята. З велізарнай колькасці матэрыялу мы выбралі тое, што здалося нам самым цікавым, тое, што дае нам магчымасць разам з вамі паразважаць».

Праглядаючы два з лішнім мільёны метраў плёнкі, стваральнікі фільма паставілі сабе за мэту выбраць перш за ўсё тое, што іх уражвае. Многія кадры, больш дакладна, адлюстраванае ў іх жыццё, уражваюць сёння гледача сваёй бязглуздасцю, сваім крывавым кашмарам, сваёй крыклівай фарсавасцю, якую не заўважалі насельнікі трэцяга рэйха, што з захапленнем беглі за машынаю Гітлера, натхнёна крочылі на незлічоных парадах вермахта, працфронту, гітлер'югенда, якія замілавана блукалі па залах мастацкіх выставак, што складаліся з партрэтаў і бюстаў фюрара... Так, адышоўшы ад вельмі простай і яснай думкі, аўтары фільма прыйшлі да складанага, глыбокага выніку, сутыкнуўшы пункты погляду нармальнага чалавека і чалавека, які, апрацаваны, адурманены фашызмам, перастаў быць чалавекам.

Як ужо гаварылася, работа над фільмам пачалася тады, калі ўжо існавала нямала дакументальных антыфашысцкіх стужак. І здымачная група, знаёмячыся з архіўным матэрыялам, рэгулярна глядзела гэтыя фільмы, каб ні ў якім выпадку не паўтарыць таго, што ўжо было.

Расказваюць, што на адным з такіх праглядаў М. Ром папрасіў кінамеханіка адключыць фанаграму, і яго таварышы, добра знаёмыя з папулярным фільмам, на момант разгубіліся. Карціна, якая, здавалася, такая стройная і выразная, раптам ператварылася ў нагрувашчванне разрозненых кадраў. У чым справа? Ды ў тым, што ўвесь гэты унікальны матэрыял з'яўляўся не чым іншым, як ілюстрацыяй да тэксту. А Міхаілу Рому захацелася, каб іх матэрыял, выкрываючы, гаварыў сам за сябе. Яму хацелася, каб з экрана не расказвалася пра фашызм, не чыталася лекцыя пра яго. Яму хацелася паказаць фашызм, які ён быў. І які ён сёння. Стваральнікам фільма хацелася, каб глядач прайшоў разам са здымачнай групай складаны шлях разумення найстрашнейшай сутнасці фашызму.

Вось чаму так захапіла рэжысёра ідэя стварыць фільм-роздум. Вось чаму сцэнарыстам так хацелася, каб дыктарскі тэкст чытаў іменна ён, а «ніхто іншы». Каб традыцыйны дыктарскі тэкст стаў аўтарскім. Справядлівасць патрабуе прызнаць, што гэта ідэя ўзнікла выпадкова. Фільм нараджаўся цяжка, і рэжысёр не раз правяраў гучанне яго частак, дэманструючы іх розным людзям. Ён тлумачыў яшчэ не агучаныя часткі, задаваў прысутным пытанні. І раптам стала ясна, што так і толькі так трэба весці размову з гледачом у гэтым фільме — тут патрэбен голас равесніка стагоддзя і нашага сучасніка!

Так была знойдзена галоўная інтанацыя размовы пра фашызм, размовы, у якой глядач становіцца субяседнікам, сааўтарам. Разам са стваральнікамі фільма ён са здзіўленнем, гневам даследуе адну з самых дзікіх і страшных з'яў дваццатага стагоддзя, і ў сэрцы яго яшчэ больш умацоўваецца рашучасць зрабіць усё, каб гэты кашмар ніколі не паўтарыўся.

Барыс ЛЬВОЎ.
(АДН).

З ПАДРУЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

Гэтыя творы робіць народная артыстка БССР С. М. Станюта з шышак, запалак, кукурузы, карэнняў дрэва, насення, «носікаў» клёна і іншага «падручнага» матэрыялу. Пра яе цікавае захапленне наша газета нядаўна расказвала.

На здымку: работы С. Станюты «Вожык», «Чаплі», «Алень», «Гусь».

ДЗЕНЬ, ЯКІХ МНОГА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

калгасе імя Войкава (я там не быў з паўгода) — кантора перабралася ў новы будынак. Невялікая зала для пасяджэнняў, пакоі для бухгалтэрыі, спецыялістаў, кабінет старшыні. Чысціня, новая мэбля.

Стары ў кажусе, што заходзіць у кантору разам з намі, з гонарам гаворыць:

— Во, і на кантору пабагацелі. А то на старую ўжо сорамна глядзець было. Халупа нейкая. Гэта ж усе пасляваенныя гады, разумееце, кантора знаходзілася ў адным месцы. Зойдзеш, а падлога пад табой прагінаецца — згніла зусім.

Старшыня калгаса Сямён Захаравіч Блінкоў — невысокі, каржакаваты мужчына гадоў за пяцьдзесят сядзеў у кабінеце і перагортваў свой справаздачны даклад.

— Вывучаеце...—жартуе сакратар.

— Ды я яго і так напамяць ведаю,—адказвае старшыня.—Цікавыя лічбы ёсць у нас. Вось паслухайце — у 1960 годзе ўвесь грашовы даход гаспадаркі складаў 180 тысяч рублёў, а летась 140 тысяч раздалі толькі на працадні, ды на выплату пенсій пайшло 25 тысяч.

— Лічбы сапраўды добрыя, — згаджаецца Булаўскі. — Рэальныя лічбы, бо тое, што далі на працадні, гэта рэальна, гэта жывыя грошы, якія ёсць у гаспадаркі. А то, бывала, раней лічыцца калгас мільянерам, а на месца паедзеш, дык у гэтага мільянера капейкі за душой няма. Пугі няма на што купіць... Лічылі ж толькі даходы, аб расходах маўчалі.

Мікалай Аляксандравіч глядзіць на гадзіннік.

— Да сходу яшчэ ёсць час. Можа, па фермах праедзем? Хачу, між іншым, вашых цялятак паглядзець. Здагадаліся, чаму?

Блінкоў крыху чырванее, потым усміхаецца і гаворыць:

— Здагадаўся, але не пазнаеце маладняк.

У цялятніку мы застаем дзвюх даглядчыц — пажылых, але жвавых жанчын.

— Памятаеце нашу размову?— пытаецца ў іх Булаўскі.

— А як жа,—адказваюць даглядчыцы.

— Леташняй вясной,—расказвае Мікалай Аляксандравіч,—дык жахліва было глядзець на цялят—худыя, змарнелыя, адны косці.

— Але ж паправілі справу, — устаўляюць жанчыны.

Сапраўды, у загарадцы стаяць сытыя, гладкія цялушкі.

— Бачу,—кажа сакратар. — А як вас разлічылі за мінулы год?

— Поўнасцю.

— І дадатковую аплату атрымалі?

— І дадатковую.

— А настрой які?

— Што трэба...—смяюцца жанчыны, потым адна з іх, трохі сумеўшыся, просіць: — Мікалай Аляксандравіч, каб як пуцёўку на курорт дастаць. Сэрца пабольвае.

— З гэтым абавязкова дапаможам,—Булаўскі дастае запісную кніжку і робіць паметку.

У кароўніку, куды мы заходзім, жывёле падаслана салома. Для калгаса імя Войкава гэта значыць нямала. Памятаю, у мінулыя гады салому тут лічылі на кілаграмы, хаця б да вясны на корм хапіла.

— А ў памяшканні бруднавата,—заўважае Мікалай Аляксандравіч.

— З людзьмі няўпраўка, — апраўдваецца старшыня. — Механізацыі ж ніякай.

Ох, гэтая механізацыя ў жывёлагадоўлі. Колькі паперы спісана на гэты конт, колькі прапаноў выказана, колькі, нарэшце, дысертацый абаронена, а гной з кароўнікаў па-ранейшаму выносяць уручную. Не, праўда, гадоў восем—дзесяць назад амаль у кожным кароўніку была падвясная дарога. Не ідэальная, вядома, механізацыя, але нешта сабе. Накідаў гной у ваганетку і вывозь на вуліцу. Усё ж не на сабе. Але нейкае начальства вырашыла, што падвясныя дарогі — гэта анахранізм, і іх перасталі выпускаць.

Я гавару аб гэтым прысутным, і яны згаджаюцца са мной.

— Навучыліся мы машынамі ўсё рабіць, — заўважае Булаўскі,—і араць, і сеяць, і ўбіраць. А ў жывёлагадоўлі з механізацыяй ніяк не клеіцца. Нашы вучоныя-механізатары толькі абяцаюць, або калі зробяць што-небудзь для фермы, дык курам на смех. Памятаю, звоняць мне з калгаса «Новы быт» і хваляцца, што саматужным спосабам зрабілі некалькі каранярэзак. Паехаў паглядзець. З чаго, вы думаеце, зрабілі гэтыя каранярэзкі? З рознага старога хламу — непатрэбных трактарных дыскаў, цвікоў і г. д. Да ўсяго гэтага падключаўся невялікі электраматор і, будзь здароў! — бручку здрабняла на кашу. Але ж, успомніў я, калгас нядаўна купіў кормапрыгатавальную машыну, вынайдзеную, як тады называлі, «мацапураўскім» інстытутам. Вялікія грошы былі заплацілі. «Куды вы яе збылі?» — пытаюся. «А тут стаіць...»—гавораць. Павялі, паказалі. Вялізная прыгожая машына. Трубкі, калёсікі, шрубкі... «Ну і чаму не выкарыстоўваеце?»—пытаюся. «Не працуе. Мы ўжо і інжынера з інстытута выклікалі. Круціў ён яе, круціў ды і адступіўся, маўляў, канструкцыйныя недахопы».

Неяк, на абласным актыве расказаў я пра такую механізацыю і пакрытыкаваў М. Мацапуру (ён тады яшчэ дырэктарам інстытута быў). Дык мяне пасля адзін адказны таварыш папракнуў, навошта я, маўляў, пакрыўдзіў паважанага вучонага, лаўрэата. Не, трэба за механізацыю жывёлагадоўлі брацца па-сапраўднаму. Гэта наша вузкае месца. Упэўнены, што на XXIII з'ездзе партыі пра гэта будзе сур'ёзная гаворка.

У кароўнік заходзяць даяркі. Булаўскі цікавіцца надоямі. А потым пытае:

— А які, дзяўчаты, сабекошт малака на вашай ферме?

— Па 14 капеек за літр.

Я расказваю, што быў нядаўна ў Стаўбцоўскім раёне і там мне назвалі ў ліку перадавых па жывёлагадоўлі адзін калгас. Паехаў туды, і што ж аказалася — на кожным літры малака гаспадарка траціць шэсць капеек.

— Во, во, — усклікае Булаўскі, — нічога сабе. Гэта, каб у фермера так было, дык за паўгода б разарыўся. А тут, бачыш, у перадавіках ходзіць. І жыве. А таму, што на дапамогу спадзяецца. Дзяржава, яна багатая, пашкадуе.

Старшыня калгаса мнагазначна пазірае на мяне. Я разумею гэты позірк, маўляў, сеў Булаўскі на любімага канька — пра эканоміку можа гаварыць гадзінамі. Падкаваны ён моцна у гэтай справе — у аспірантуры вучыцца.

Калі выходзім на вуліцу, Булаўскі гаворыць:

— Лічыць, лічыць, — вось што цяпер галоўнае. На гэта і людзей нацэльваем. І людзі, скажу вам, вельмі цікавяцца. Учора быў у саўгасе «Праўда». Разгаварыўся з адным старым рабочым, «Вось, — кажу, — ваш саўгас упершыню закончыў год з прыбыткам». «Ведаю», — гаворыць і расказвае мне такі анекдот: «Адзін чалавек купляў і прадаваў яйкі за адну і тую ж цану. Калі яго спыталі, навошта ён гэта робіць, чалавек адказаў: «Мне гэта выгадна. Перад тым, як прадаць, я адварваю яйкі, і навар, такім чынам, застаецца мне». Вось на такім навары і мы раней жылі...

Я ведаю, што Булаўскі мае прамое дачыненне да зрухаў у гэтай гаспадарцы. У мінулыя гады саўгас, які спецыялізуецца на птушкагадоўлі, вельмі многа траціў на вытворчасці птушынага мяса. Справа ў тым, што вырошчваць на мяса птушку яйканоскіх парод эканамічна нявыгадна. Вельмі нізкая аддача на кармы.

Дырэктар саўгаса Б. Лычкоўскі, малады энергічны чалавек, рашыў зрабіць так, як практыкуюць у многіх птушкагадоўчых гаспадарках у нашай краіне і за мяжой — забіваць пеўнікаў (яны ў асноўным ідуць на мяса) у сутачным узросце, а на сэканомленыя сродкі (кармы, памяшканне і г. д.) вырошчваць дадаткова нясушак. У гэтым ёсць прамая эканамічная выгада.

У Птушкапроме, якому падначалены саўгас, запярэчылі гэтаму, бо ў іх свой план вытворчасці мяса. Тады пайшоў Лычкоўскі ў райком і папрасіў падтрымкі. Булаўскі ўважліва паглядзеў разлікі і сказаў:

— Дзейнічай...

Прыйшлося, неўзабаве, Мікалаю Аляксандравічу мець гаворку з дырэктарам трэста, але ён настаяў на сваім.

Я ўспамінаю гэтую гісторыю і пытаюся жартам у сакратара, як райком дзеліць сферы ўплыву ў раёне. Справа ў тым, што тут знаходзяцца гаспадаркі трох трэстаў: малочна-гародніннага, птушкагадоўчага і адкормачнага. Калгасы ж і адзін саўгас падначалены ўпраўленню сельскай гаспадаркі.

Мікалай Аляксандравіч усміхаецца.

— Ладзім. Людзі, што стаяць на чале трэстаў, спрактыкаваныя, разумныя. Але мітусня бывае залішняя. Эканамічна ўсе гаспадаркі трывала ўпісаны ў жыццё раёна. Вытворчасць кантралюем мы, тэхніка для іх паступае таксама праз раённыя арганізацыі. Не, мая асабістая думка, — у раёне павінна быць адна сельскагаспадарчая ўстанова. Спецыялізацыя? Дык можна зрабіць у раённым упраўленні аддзел, скажам, птушкагадоўлі, пасадзіць там трох спецыялістаў, і справа пойдзе. Ва ўсякім выпадку яны часцей будуць наведваць гаспадаркі. А то, я ведаю, некаторыя спецыялісты Птушкапрома па паўгода не бываюць у саўгасах.

... Сход закончыўся падвечар ужо. З раніцы трымаў мароз, а цяпер раптам памякчэла.

— Відаць, вецер з поўдня, — заўважыў Мікалай Аляксандравіч. — На адлігу.

Мы доўга ехалі моўчкі. Потым сакратар павярнуўся да мяне, весела спытаўся:

— Ну, як спадабаўся сход? Малайцы войкаўцы. На вялікія справы размахнуліся. І асабліва радуе, што настрой у іх бадзёры. А гэта ж вельмі важна.

Потым, зірнуўшы праз акно на палі, што шарэлі ў надыходзячых прыцемках, заўважыў:

— Вясна сёлета чакаецца ранняя. Значыць, адсеемся рана. Значыць, усё будзе добра.

Мінскі раён.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

1 сакавіка

Першая праграма. 12.55 — першынство свету па фігурнаму катанню. Паказальныя выступленні. Перадача з Давоса. 14.30 — тэлевізійнае акно сатыры (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — «Табе, юнацтва!» Перадача з Ленінграда. 18.00—тэлевізійныя навіны. 18.20 — насустрач XXIII з'езду КПСС. «Пасланцы камуністаў». 18.50 — «Лушка». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі імя Даўжэнкі. 20.10 — «Свет сёння» (М). 20.40 — «Школа ігры на баяне». (Урок другі). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — на атрыманне Ленінскай прэміі (М). 22.30 — першынство свету па фігурнаму катанню. Паказальныя выступленні. Паўтор ранішняй перадачы (у запісе) (М).

Другая праграма. 12.30 — тэлевізійныя навіны (М). 12.45 — «На прасторах Радзімы» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Сельская навіна» (М). 19.00 — М. Горкі. «Канавалаў». Тэлевізійны спектакль. Перадача з Ленінграда. 20.10 — «Фантан». Кінафельетон. 20.40 — «Як склалі песню» (М).

2 сакавіка

Першая праграма. 14.40 — II зімовая спартакіяда народаў СССР. Перадача са Свярдлоўска. 16.45—праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.20 — школьная фільматэка. Для вучняў 9-га класа. «Напярэдадні». Мастацкі фільм. 18.55 — насустрач XXIII з'езду КПСС. «Дзённік пяцігодкі». Дзень 61-шы. 19.30—«Камерныя цыклы». А. Багатыроў. «Санеты Шэкспіра». 20.00—тэлевізійныя навіны. 20.25 — міжнародная сустрэча па футболу. «Ферэнцвараш» (Венгрыя) — «Інтэрнацыянале» (Італія). Перадача з Будапешта. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 22.20 — да фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР. Канцэрт Дзяржаўнага народнага аркестра БССР. Салісты Я. Цвятаева і народны артыст БССР З. Бабій.

Другая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—канцэрт (М). 17.20 — скарбы побач з намі. «Незвычайная клініка». Рэпартаж з аддзела рэстаўрацыі і гігіены Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя Ул. І. Леніна (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Дзе ты, мая Зульфія?» Мастацкі фільм (М). 20.10 — дзённік спартакіяды (М). 20.25 — канцэрт. 21.20 — рэклама, аб'явы. 21.30 — «Пах сена». Тэлевізійны фільм. 22.20 — у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда.

3 сакавіка

Першая праграма. 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для дзяцей. «У краіне загадак» (М). 17.15 — для школьнікаў. «Піянерыя». Тэлевізійны часопіс. Перадача з г. Горкага. 18.00 — «Партыі радавыя». Расказ пра дэлегатаў XXVI з'езда КПБ. 18.20 — школьная фільматэка. «Якуб Колас». Дакументальны фільм. 18.40 — тэлевізійныя навіны. 19.00 — па вашых заяўках. Канцэрт. 19.30 — «Эстафета навін» (М). 20.50 — «Чырвонае лісце». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Беларусьфільм». 22.30 — першынство свету па хакею. (Адкрыццё). Канада — ЗША. Перадача з Любляны.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Сустрэча ў эфіры». Кампазітары Н. Макарава і Л. Аусцер (М). 19.20 — дзённік спартакіяды (М). 19.30 — «Ці добра вас абслугоўваюць?» Рэпартаж з мінскага магазіна «Мода». 20.05 — чалавек і прырода. «Падземныя альпіністы». «Птушкі з песень». 20.40 — рэклама, аб'явы. 20.50 — лепшыя фільмы савецкага кіно. «Канец Санкт-Пецярбурга» (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 02312